Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ЛІСТАПАД 28 1932 г. № 265 (4517)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Хутчэй перабудоўваць работу. Я. ІВАШЫН — Лепш кіраваць цэх'ячэйкай і партгрупай (2 ст.). БАСКІН, ДЗІХЦЯР — Умацаваць сацыялістычную дысцыпліну працы (3 стар.).

Вершы: Я. КУПАЛА — Суд ідзе... (4-я стар.); КРАПІВА — З фашыстоўскай падваротні (4 стар.).

Я. КОЛАС — Далоў панскую інквізыцыю (4 стар.).

Засталося адгрузіць 4.000 тон (1 стар.).

Задача барысаўскай партарганізацыі — шырэй разьвіць бальшавіцкую работу ў масах, лепш кіраваць нізавымі партзьвеньнямі (2 стар.).

Пратэст б. паслоў польскага сойму, кіраўнікоў «Грамады» і «Змаганьня» супроць расправы над тав. Тарашкевічам (4 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Германія ў тупіку (1 стар.).

Кампартыя атрымала яшчэ адзін мандат (1 стар.).

Інтэрв'ю карэспандэнта ТАСС з польскім міністрам Бэкам (1 стар.).

Хутчэй перабудоўваць работу

Перабудова арганізацыйна-партыйнай, агітацыйна-масавай работы мяркуе сабой паляпшэньне кіраўніцтва па ўсіх напрамках, павышэньне кіруючай і арганізуючай ролі партыйнай ячэйкі, групы, а на гэтай аснове—**лепшую мабілізацыю мас** на ажыцьцяўленьне складаных задач бягучага пэрыяду.

«Мы павінны здолець перабудаваць сваю работу і ячэек у першую чаргу такім чынам, каб аказацца на вышыні стаячых перад намі задач—кіраўніцтва масамі і арганізацыі іх вакол лёзунгаў партыі на барацьбу за іх ажыцьцяўленьне» **(Кагановіч).**

Як ажыцьцяўляюцца гэтыя важнейшыя ўказаньні партыі на месцах—у раёнах, ячэйках, як ідзе перабудова?

Рэдакцыя газэты «Зьвязда» наладжвае зараз праверку выкананьня пастаноў пленуму ЦК КП(б)Б і абмен вопытам перабудовы. З гэтай мэтай арганізован абмен паласамі раённых газэт з асьвятленьнем становішча арганізацыйнай і партыйна-масавай работы.

Сёньня мы друкуем паласу «Бальшавіка Барысаўшчыны».

Матар'ялы абменнай паласы паказваюць, што барысаўская партарганізацыя дабілася ўжо **некаторых** зрухаў у перабудове работы. На буйнейшых прадпрыемствах (імя Домбаля, Бярэзінскі камбінат) умацаваны работнікамі цэхавыя ячэйкі, паляпшаецца партыйны дзень, больш увагі аддаецца расстаноўцы сіл, работе з кандыдатамі і г. д.

Асобныя партыйныя ячэйкі і групы (якія паказаны ў матар'ялах) барысаўскай арганізацыі дабіліся ўжо нядрэнных рэзультатаў перабудовы.

Абавязак раённага камітэту іх вопыт дацальна вывучыць і перанесьці ў іншыя вытворчыя ячэйкі. Мы падкрэсьліваем гэта таму, што **на большасьці** прадпрыемстваў гораду перабудова партыйна-масавай работы праходзіць павольна, часта павярхоўна і фармальна.

На фанэрным заводзе і на іншых прадпрыемствах (за выключэньнем гуты імя Домбаля) партгрупы працуюць дрэнна, дзе-нідзе яны нават распаліся.

Правёўшы арганізацыйную перабудову, райком і многія калектывы **не аддалі** патрэбнай увагі паляпшэньню зьместу работы, павышэньню яе якасьці.

Мала стварыць цэхавую ячэйку, партгрупу, арганізаваць агіткалектыў, трэба **штодзенна імі кіраваць,** дапамагаць сакратару, вучыць маладыя кадры.

Гэта асабліва важна, асабліва неабходна ва ўмовах Барысаўшчыны, дзе большасьць прадпрыемстваў недавыконвае прамфінплян. Тут павышэньне якасьці партыйнага дня, паляпшэньне работы кожнага зьвяна, асабліва сярэдняга і нізавога, разьвіцьцё бальшавіцкай агітацыі, шырокай масава-растлумачальнай работы адыгрывае **рашаючае значэньне.**

І тым ня менш у Барысаве, гэта трэба проста сказаць, **недаацэньваецца** такая форма работы, як групавая агітацыя.

Райком даў дырэктыву, ячэйкі і групы выбралі агітатараў, стварылі агіткалектывы. Але аб рабоце агітатара, аб дапамозе яму не паклапаціліся. Гручавых агітатараў у рабоце, у жыцьці прадпрыемства ня відаць, агіткалектывы не працуюць. У гэтым праявіўся фармальны падыход да выкананьня важнейшай дырэктывы пленуму ЦК.

Іменна таму яшчэ горш пастаўлена масавая, агітацыйная работа на вёсцы, сярод аднаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў. Ход збожжа і бульбазагатовак вельмі выпукла ўказвае на гэты **буйнейшы недахоп** раённай арганізацыі.

Было-б эразумела, няправільна гаварыць аб адсутнасьці масавай работы. Масавая работа праводзіцца, але не сыстэматычна, ня штодзенна, ня глыбока, а галоўным чынам па-кампанейску, наляту.

Барысаўская арганізацыя і яе кіраўніцтва абавязаны з настойлівасьцю, вартай бальшавікоў, узяцца за ліквідацыю гэтага недахопу, за шырокае разьвіцьцё агітацыі ў масах, за штодзенную палітычна-выхаваўчую работу ў цэху, у брыгадзе. У першую чаргу трэба наладзіць заняткі агіткалектываў, бо ад іх работы залежыць якасьць і размах агітацыі.

Аб кадрах, аб людзях прыходзіцца гаварыць ня толькі ў сувязі з групавымі агітатарамі. На прадпрыемствах Барысава часта можна пачуць скаргі сакратара ячэйкі, груп парторга на слабую падрыхтаванасьць і адсутнасьць дапамогі.

Побач з разьвіцьцём курсаў, семінараў актыву, неабходна дабіцца, каб кіруючыя работнікі (і калектываў, і райкому) **больш былі на месцах,** у ячэйцы, у цэху, у брыгадзе і там дапамагалі маладому работніку, інструктавалі яго.

«Пісаньне рэзалюцый трэба зьвесьці да мінімуму і з 20 цяперашніх рэзалюцый пакінуць адну. Партыйныя камітэты павінны, адкінуўшы мэтады папяровага кіраўніцтва, сядзець у цэхах» (Кагановіч). На гэта прыходзіцца асобна ўказаць у сувязі з фактамі, якія ў апошні час выкрыты ў Барысаве.

На папяровай фабрыцы з ліценя не праводзіліся партыйныя сходы, ячэйка спыніла ўсякую работу, па сутнасьці арганізацыйна развалілася. На фабрыцы «сядзелі» інструктары райкому **(Заркін і Вальфсон)** і не заўважалі гэтага. Сакратар ячэйкі (лічыўся ў сьпісе райкому) Абрамовіч ня прыхнаў (?) сябе сакратаром. Для райкому гэты факт (выяўлены брыгадай ЦКК) зьявіўся таксама нечаканасьцю.

Гэты факт кідае прамень сьвятла і на становішча раённага кіраўніцтва ячэйкамі. Відаць, перабудова не закранула яшчэ **глыбока** і сыстэмы кіраўніцтва ячэйкамі. Відаць, перабудова не закранула яшчэ **глыбока** і сыстэмы кіраўніцтва райкому ячэйкамі.

Іменна на глыбіні—на замацаваньні арганізацыйнай перабудовы па ўсіх напрамках павінна быць сканцэнтравана зараз увага барысаўскай партыйнай арганізацыі.

Сапраўдная, глыбокая перабудова работы, шырока разьвітая агітацыя, масавасьць і ёсьць важнейшыя вагары пасьпяховага выкананьня прамфінплану.

Гэтыя вагары трэба **поўнасьцю** прывесьці ў рух.

На пленуме Менгаркому КП(б)Б

На пасяджэньнях 24 і 25 лістапада пленум заслухаў даклады дырэктароў чатырох фабрык і заводаў аб выкананьні прамфінпляну за 10 месяцаў і даклад аб рэалізацыі пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб нізэйшай школе.

З чатырох фабрык і заводаў, аб рабоце якіх пленум заслухаў даклады, толькі адна фабрыка «Кастрычнік» выкапала плян, астатнія тры: абутковая, завод імя Молатава і «Камунар» недавыканалі сваіх планаў.

У чым сакрэт перамогі фабрыкі «Кастрычнік» і адставаньне трох апошніх? На гэта пытаньне даюць выразныя адказы таварышы, якія выступаюць на пленуме.

Швэйная фабрыка **«Кастрычнік»** прамфінплян першага кварталу выканала на 98,5 проц. Гэта недавыкананьне ўзварушыла ўсю партарганізацыю заводу і рабочую грамадзкасьць. Было створана 35 партыйных груп, якія правялі вялікую партыйна-масавую работу ў пізавым вытворчым зьвяне—брыгадзе. У выніку гэтай работы расьлі рады ўдарнікаў (іх цяпер на фабрыцы 98 проц.), расьлі рады парткалектыву. За дзесяць месяцаў прынята ў партыю 105 чал.

Перабудаована сыстэма зарплаты. У мінулым годзе была поўная ўраўнілаўка, існавала сыстэма 15-процантнага прыработку для ўсіх катэгорый. Таму часта рабочыя з меншай кваліфікацыяй атрымлівалі больш, чым кваліфікаваныя. Гэта было выпраўлена. Процант прыработку стаў залежаць ад кваліфікацыі. Так, напрыклад, рабочыя 6-га разраду цяпер маюць прыработку 32 проц., першыя два разрады — 15 проц. Значная частка рабочых ахоплена прэміяльна-прагрэсыўнай зарплатай.

«Кастрычнік» — фабрыка гаспадарча-разлікавых брыгад, якіх ёсьць ужо 32.

— Вось чаму фабрыка выканала прамфінплян II кварталу на 105 проц., а першага паўгодзьдзя — на 101 проц.

Перад фабрыкай стаіць галавая задача—палепшыць якасьць прадукцыі, бо яна на сёньня яшчэ поўнасьцю не задавальняе спажыўца, дабіцца выніжэньня сабекошту, які ў трэцім квартале павялічыўся на 1,5 проц.

Зусім інакш стаіць справа на абутковай фабрыцы і скабліва на заводах «Камунар» і імя Молатава. Першая выканала свой 10-месячны прамфінплян на 91 проц. (замест 968.110 пар абутку выпушчана 881.101 пара), «Камунар» — на 80 проц. і ў вусім глыбокім тыле цягнецца завод імя Молатава.

Гэта недавыкананьне тлумачыцца галоўным чынам тым, што гэта фабрыка і заводы, асабліва завод імя Молатава, дрэнна змагаліся за ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна.

Няма барацьбы з цякучасьцю рабочай сілы. Так, на «Камунары» за 10 месяцаў пакінула завод 342 чал., прынята — 806; на заводзе імя Молатава зволілася 1.096, прынята новых 1.100.

На заводзе імя Молатава прагуляна 2.575 рабочых дзён. Значны процант іх і на «Камунары».

Выступіўшы з прамовай сакратар гаркому тав. **Шпэнтараў** зьвярнуў увагу пленуму на зьнішчэньні гэтых недахопаў, на барацьбу за абсталяваньне рабочых інтэрнатаў, за распарадак у цэху і г. д.

***

Тав. **Грыцкевіч** у сваім дакладзе і тав. **Зяньковіч** у судакладзе ахарактарызавалі дасягненьні ў рабоце нізэйшых школ г. Менску і раёну. Іх матар'яльная база значна вырасла. Па бюджэту 1931-32 году на школы выдаткавана 2.800 тыс. руб. Бюджэт-жа 1932-33 навучальнага году складае 5.600 тыс. руб.

Пасьля верасьнёўскай пастановы ЦК УсеКП(б) былі выпадкі правы-«лявацкіх» скажэньняў у рабоце школ. Яны выяўляліся ў тым, што паасобныя работнікі імкнуліся павярнуць школу на стары лад, адарваўшы яе ад жыцьця, праводзіць у ёй толькі славесную, схаластычную работу. З другога боку, былі і такія настрої, прадсказўнікі якіх гаварылі, што не патрэбна спэцыяльная школа. Школа па іх думцы павінна быць цэхам прадпрыемства. Гэтым настроям дан зьнічальны адпор.

Рад партыйных калектываў ня кіруе работай школ, ня цікавіцца, як праводзіцца палітэхнізацыя, асобныя работнікі ігнаруюць школу. Гэта, напрыклад, было ў друкарні імя Сталіна, кіраўніцтва якой доўгі час адмаўлялася дапамагчы сваёй-жа ФЗС у абсталяваньні майстэрні, патрабуючы за варштаты ўплаты ў паўтары разы даражэй, чым яны каштавалі ім. Такім адносінам да школы трэба даваць самы бязьлітасны адпор.

Як дакладчыкі, так і рад выступаўшых у спрэчках, адзначылі слабасьць работы піянэрарганізацыі і камсамольскіх ячэек у школах. Піянэратрады не забясьпечаны важатымі. Менскі гарком ЛКСМБ, просты абавязак якога наладзіць піянэрработу, дапамагчы школе рэалізаваць пастанову ЦК УсеКП(б) — выпусьціў з-пад сваёй увагі гэты вучастак работы.

Дабіцца мінімальнага процанту адстаючых вучняў, поўнасьцю рэалізаваць верасьнёўскую пастанову ЦК УсеКП(б) аб нізэйшай школе — такая задача, пастаўленая пленумам перад школамі.

М. С.

Засталося адгрузіць 4.000 тон

ня спыняць работы да поўнага выкананьня пляну

ПАСЬПЯХОВА ЗАВЯРШЫЦЬ АДГРУЗКУ

БССР — НАПЯРЭДАДНІ ЗАВЯРШЭНЬНЯ АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ. ПАВОДЛЕ ДАНЫХ НА 27 ЛІСТАПАДА ЎСЯГО ПА РЭСПУБЛІЦЫ АДГРУЖАНА 97,8 ПРОЦ. ПЛЯНУ.

ДЗЕСЯТКІ РАЁНАЎ, СОТНІ СЕЛЬСАВЕТАЎ І КАЛГАСАЎ НЯ ТОЛЬКІ ВЫКАНАЛІ, АЛЕ І ЗНАЧНА ПЕРАВЫКАНАЛІ СВАЁ ЗАДАНЬНІ. МСЬЦІСЛАЎСКІ РАЁН, НАПРЫКЛАД, РЭАЛІЗАВАЎ ПЛЯН НА 243,9 ПРОЦ., ВЕТКАЎСКІ—НА 228,9, СУРАЖСКІ—НА 146,6 ПРОЦ., ЛАГОЙСКІ — НА 135 ПРОЦ., БУЗЬДЗЕНСКІ—НА 134 ПРОЦ., КЛІМАВІЦКІ НА 126 ПРОЦ., ПЛЕШЧАНІЦКІ—НА 115 ПРОЦ., АРШАНСКІ—НА 105 ПРОЦ., ЖЛОБІНСКІ—НА 112 ПРОЦ., ЗАСЛАЎСКІ—НА 111 ПРОЦ. І Г. Д.

СЁНЬНЯ МЫ ДРУКУЕМ РАПАРТЫ ЯШЧЭ РАДУ РАЁНАЎ, ЯКІЯ Ў ВЫНІКУ ЎДАРНАЙ РАБОТЫ, ДАБІЛІСЯ ПЕРАМОГ НА ФРОНЦЕ АДГРУЗКІ.

АЛЕ ПОБАЧ З ГЭТЫМ РАД РАЁНАЎ ДАГЭТУЛЬ ЯШЧЭ ЦЯГНУЦЦА Ў ХВАСЬЦІ. ДУБРОВЕНСКІ РАЁН НА 26 ЛІСТАПАДА АДГРУЗІЎ 72,5 ПРОЦ. ПЛЯНУ, АСІПОВІЦКІ 76,1 ПРОЦ., ЦЕРАХАЎСКІ — 76,3 ПРОЦ І ІНШ.

НАМ ЗАСТАЛОСЯ АДГРУЗІЦЬ ЯШЧЭ 4.065 ТОН. ПРЫ САПРАЎДЫ ЎДАРНЫХ ТЭМПАХ, ПРЫ БЕСЬПЕРАБОЙНАЙ РАБОЦЕ ГЭТУЮ КОЛЬКАСЬЦЬ МОЖНА АДГРУЗІЦЬ ЗА 1-2 ДНІ. І ГЭТАГА МЫ ПАВІННЫ ДАБІЦЦА ВА ШТО-Б ТАМ НІ СТАЛА.

ЦК КП(б)Б, СНК, „Зьвязьдзе"

Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і СНК БССР, пры ўдарнай рабоце райтроек плян адгрузкі бульбы для ЛВА на 25 лістапада па сыстэме Белплодагароднины ня толькі выкананы, але і перавыкананы. Брыгада камандзіраў ЛВА пераключаецца на ліквідацыю прарыву ў загатоўках бульбы на Украіне.

УПАУНАВАЖАНЫ ЛВА—КУШНЭР.

РАПАРТУЕМ ПАРТЫІ І УРАДУ

ЕЛЬСК. Настойлівай работай, рашучым адпорам дэмабілізацыйным настроям, Ельскі раён дабіўся поўнага выкананьня пляну адгрузкі бульбы пралетарам Ленінграду. Усяго адгружана 1.130 тон.

Зуевіч.

***

СТАРЫЯ-ДАРОГІ. Заданьне па адгрузцы бульбы Ленінграду на 25 лістапада выканана на 100 проц. Адгрузка працягваецца.

Райком КП(б)Б **ЦАЙЛІНГОЛЬД.**
Райвыканком **БАРСУКЕВІЧ.**
Райзаг **РАХЛІН.**

***

УВАРАВІЧЫ. Уваравіцкі раён рэалізаваў поўнасьцю плян адгрузкі бульбы. На 25-га лістапада адгружана 5.033 тоны, што складае 100 проц. пляну. Адгрузка працягваецца.

Райтройка: **Мурачоў, Цёвны, Караленка.**

***

РЭЧЫЦА. Дадатковае заданьне па адгрузцы бульбы Ленінграду выканана. Усяго адгружана 2.558 тон.

Райком КП(б)Б **ВЕРАМЕЙЧЫК.**
Райвыканком **Шляхцінаў.**
Райсаюз **Ярмоленка.**

***

ГАРАДОК. Заданьне па адгрузцы бульбы Ленінграду выканана на 103 проц. Усяго адгружана 3.100 тон. Адгрузка працягваецца.

Райком КП(б)Б **Ельман, РВК Еўдасеў.**
Упаўнаважаны ЛСПО **Кеш.**

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ КАРЭННЫ ЗРУХ У ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ!

Рашуча змагацца са спэкуляцыяй збожжам

Загатоўлена на 20 лістапада

Калгасамі МТС	Інш. калгасамі	Аднаасобнікамі	Усяго загатоўлена	Разам з насеньпазыкай
98,1	72,2	52,1	60,7	51,4

Загатоўлена на 25 лістапада

Калгасамі МТС	Інш. калгасамі	Аднаасобнікамі	Усяго загатоўлена	Разам з насеньпазыкай
99,1	73,2	54,6	62,4	52,9

Рэзультаты нездавальняючыя

Тэмпы збожжазагатовак па БССР за апошні час рэзка зьнізіліся. Становішча на гэтым вучастку нездавальняючае і сыгналізуе аб дэмабілізацыйных настроях, аб прыпушчэньні клясавай пільнасьці ў адносінах да манэўраў кулацкіх элемэнтаў, накіраваных на зрыў загатовак у радзе раёнаў і сельсаветаў.

За апошнія пяць дзён загатоўлена толькі 1,7 проц. гадавога пляну. На 25 лістапада па БССР здана 60,7 проц. заданьня.

Практыка збожжазагатовак г. г. паказвае, што посьпех справы цалкам залежыць ад базыдольнасьці кіраўных партыйных і савецкіх арганізацый, ад іх уменьня АРГАНІЗАВАЦЬ загатоўкі, мабілізаваць актыў, павесьці яго супроць клясава-варожых элемэнтаў.

Толькі дзякуючы баявой рабоце сельпартячэек і сельсаветаў і ўмеламу спэцыяльнаму кіраўніцтву раённых арганізацый, КАМАРЫНСКІ, ТУРАЎСКІ І ЛЕЛЬЧЫЦКІ раёны выканалі пляны збожжазагатовак.

Вопыт работы перадавых сельсаветаў: Першамайскага (Слуцкі раён), Жартайскага (Барысаўскі раён), і раду іншых паказвае, што толькі бальшавіцкая арганізацыя загатовак вырашае посьпех кампаніі.

Чырвонапольскі, Крупскі, Горацкі і інш. раёны, якія не забясьпечылі ўвязкі збожжазагатовак з іншымі гаспадарча-палітычнымі заданьнямі і праводзілі на практыцы тэорыю чарговасьці кампаній: «рэжэй скончым сяўбу і адгрузку бульбы, а потым возьмемся за збожжа»—плянуцца ў апошніх радох здатчыкаў.

Вопыт збожжазагатовак г. г. паказвае таксама, што «лявацкая» недаацэнка аднаасобнага сэктару, ігнараваньне ўдзельнай вагі аднаасобнікаў у загатоўках зьяўляецца непасрэднай прычынай зрыву выкананьня заданьняў па радзе раёнаў. Аднаасобны сэктар па БССР да 25 лістапада здаў па самазабавязацельствах толькі 54,6 проц. пляну. Ва Уваравіцкім раёне, напрыклад, за апошні час сярод аднаасобнікаў загатоўлена толькі 4,9 проц. заданьня.

УЗЬНЯЦЬ МАСАВУЮ РАБОТУ СЯРОД АДНААСОБНІКАЎ, ШЫРОКА ЎЖЫВАЦЬ ВЫПРАБАВАНЫЯ МЭТАДЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА, ЛІКВІДАВАЦЬ СПРОБЫ ГОЛАГА АДМІНІСТРАВАНЬНЯ Ў АДНОСІНАХ ДА БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ—вось асноўныя ўмовы, якія забясьпечваюць прамогу на гэтым вучастку загатовак.

Абсалютна недапушчальнае становішча са спатканьнем цвёрдых заданьняў. Апошні тэрмін выкананьня цьвёрдых заданьняў, усталёваны партыяй і ўрадам, скончыўся яшчэ 20 верасьня. З таго часу прайшло больш дзьвух месяцаў, між тым да 25 лістапада спагнана толькі 37,3 ПРОЦ. Аб чым гаворыць гэта лічба? Аб аслабленьні клясавай пільнасьці ў радзе нізавых сельпартарганізацый, аб прымірэнцтве да кулака, аб тым, што кулак скарыстоўвае гэта становішча ў сваіх інтарэсах. Ён сабатуе здачу збожжа, хавае яго ў сьвірнах, разбазарвае на рынку, агітуе сярод несьвядомай часткі калгасьнікаў і аднаасобнікаў за невыкананьне ня самаабавязацельстваў перад дзяржавай. У тым-жа Уваравіцкім раёне за апошні месяц цьвёрдазаданьнікі здалі толькі 1,3 проц. пляну.

РАЗЬБІЦЬ КУЛАЦКІЯ МАНЭЎРЫ — такая задача стаіць перад усімі арганізацыямі.

Калгасы МТС паказваюць узор выкананьня самаабавязацельстваў перад дзяржавай, здаўшы 99,1 проц. пляну. Машына-трактарныя станцыі на справе дэманструюць вялікую перавагу сацыялістычнай гаспадаркі.

Горш стаіць справа па іншых калгасах. Райкалгасасаюзы не забясьпечылі жывога атрацыйнага кіраўніцтва здачай збожжа; у выніку плян выкананы толькі на 73,2 проц.

У калгасах імя Літвінава, «Пралетарская свабода», КЛІМАВІЦКАГА РАЁНУ, пад уплывам кулакоў не прыступілі да малацьбы, пшаніца парасла ў снапох і расьцягваецца жывёлай. Заможнікі, пралезшыя ў калгасы «Дружба», «Іскра сацыялізму», РАГАЧОЎСКАГА РАЁНУ, разбазараюць, расьцягваюць збожжа, а барацьба з імі не вядзецца.

У калгасах «Дружба», «Чырвоная Дубрава», Брагінскага раёну, кулацка-рвацкія тэндэнцыі не сустракаюць належнага адпору.

Неабходна мабілізаваць масы калгасьнікаў на першачарговае выкананьне іх абавязкаў перад дзяржавай, на адпор кулацка-месьніцкім тэндэнцыям.

Трэба ўзмацніць барацьбу са спэкуляцыяй збожжам, правесьці шырокую масавую работу вакол дырэктывы партыі аб збожжазагатоўках і калгасным гандлі, Гандаль збожжам дазваляецца толькі пасьля выкананьня распубліканскага пляну загатовак. Такі закон Ураду.

І, нарэшце—дрэнна выконваецца плян звароту насеньпазыкі, што адмоўна адбіваецца на ажыцьцяўленьні агульнага пляну збожжа загатовак. Да 25 лістапада заданьне па звароце насеньпазыкі выканана толькі на 10,4 проц. Трэба памятаць, што НАСЕНЬПАЗЫКА ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА НЕАДЛУЧНАЙ ЧАСТКАЙ АГУЛЬНАГА ЗАГАТОЎЧАГА ПЛЯНУ. Толькі той раён поўнасьцю выконае заданьне па збожжазагатоўках, які ліквідуе запазычанасьць па насеньфондах.

Тэмпы збожжазагатовак павінны быць неадкладна ўзмоцнены.

ГЕРМАНІЯ Ў ТУПІКУ

Пасяджэньне рэйхстагу—6 сьнежня

БЭРЛІН, 25. Як паведамляе агэнцтва Вольфа, старшыня рэйхстагу Герынг склікае першае пасяджэньне рэйхстагу на 6 сьнежня г. г.

Перагаворы Кааса з лідэрамі партый

БЭРЛІН, 25. Сёньня лідэр партыі цэнтру Каас вёў перагаворы з усімі лідэрамі партый, якія намечаны для ўключэньня ва ўрад «нацыянальнай канцэнтрацыі». З Гітлерам Каас меў двухгадзінную гутарку. Апрача таго, Каас гутарыў з Гугенбергам і Дэйнгельдзеем (народная партыя) і з лідэрам баварскай народнай партыі Шэфэрам.

Яшчэ сёньня Каас зробіць даклад Гінденбургу аб рэзультатах сваіх перагавораў.

Няўдача Кааса

БЭРЛІН, 25. Агэнцтва Вольфа паведамляе: «Сёньня прэзыдэнт Гінденбург прыняў лідэра партыі цэнтру Кааса, які паведаміў яму, што старшыні баварскай народнай і германскай народнай партый абяцалі яму прыняць удзел у нарадах аб праграме работ ураду, які апіраецца на парляманцкую большасьць, а старшыні германскай нацыяналістычнай і нацыянал-сацыялістскай партыі адхілілі ўдзел у гэтых нарадах. З гэтай прычыны Каас прасіў прэзыдэнта вызваліць яго ад далейшых перагавораў з партыямі. Прэзыдэнт Гінденбург выказаў яму падзяку за яго стараньні».

Назначэньне новага канцлера адкладваецца

БЭРЛІН, 26 (ТАСС). **Назначэньне новага канцлера, якога чакалі сёньня, адкладзена Гінденбургам на некалькі дзён.** Паводле весткі газэт, адтэрміноўка матывуецца жаданьнем высьвятліць адносіны асобных партый да пэрсанальнага складу намечанага «прэзыдыяльнага» габінэту.

Амаль увесь друк указвае, аднак, што з прычыны выяўленай немагчымасьці ствараць у рэйхстазе ўрадавую большасьць, новы «прэзыдыяльны» габінэт асуджан на пастаянныя канфлікты з рэйхстагам. І прычыны гэтага ва ўрадавых колах абгаворваецца пытаньне аб заключэньні свайго роду «перамір'я» з рэйхстагам на зімовы пэрыяд. Пад гэтым «перамір'ем» разумеецца, згодна паведамленьня газэт, што рэйхстаг, ня ўзьнімаючы пытаньня аб давер'і ўраду, адтэрмінуе на некалькі месяцаў сваю работы.

Непакой буржуазнай прэсы

БЭРЛІН, 25. Камэнтуючы спыненьне перагавораў паміж Гітлерам і Гінденбургам, рад уплывовых буржуазных газэт выказвае жаль з повазу нацыяналага канца перагавораў і баіцца далейшага абвастрэньня ўнутрыпа літычных супярэчнасьцяй у краіне. «Дэйчэ Альгемэйнэ Цэйтунг» у асьцярожнай форме ставіць пытаньне, ці ня было-б больш правільным з боку Гінденбурга ўступіць патрабаваньням Гітлера, даручыўшы яму складаньне новага «прэзыдыяльнага» ўраду. Газэта раіць дабівацца адзінства ў «нацыянальным лягеры».

«Нават сёньня,—піша газэта,—мы яшчэ адмаўляемся верыць у поўную безнадзейнасьць адзінства ў нацыянальным лягеры. У іншым выпадку наступіў-бы найбольш цяжкі час ва ўсёй пасьляваеннай гісторыі. Ні адзін урад ня можа трымацца на штыхах».

У падобным-жа духу піша аб гэтым і «Бэрлінэр Бэрзэн цэйтунг». Газэта таксама выказваецца супроць звароту фон-Папэна і дамагаецца працягу перагавораў з Гітлерам. «Кёльнішэ цэйтунг» выказвае жаль з повазу таго, што ня ўдалося зьвязаць са справай дзяржаўнага кіраўніцтва мільёны, людзей якія гатовы на адвары і любяць бацькаўшчыну. Газэта выказвае надзею, што Гінденбург не даручыць складаньня ўраду фон-Папэну. Орган партыі цэнтру «Германія» рэзка выступае супроць повага прыходу да ўлады ўраду фон-Папэна.

„860 тысяч пралетарскіх выбаршчыкаў нельга забараніць"

Забарона „Ротэ фанэ"

БЭРЛІН, 26. **«Ротэ фанэ» зноў забаронена на 3 тыдні.** Аб прычынах забароны нічога не дазволена друкаваць. «Берлін ам Морген» піша: «у момант назначэньня новага ўраду, задачай якога будзе яшчэ з большай сілай выступіць супроць працоўных, 860 тыс. камуністычных выбаршчыкаў Бэрліну пазбаўлены магчымасьці давядзецца думкі аб падрэсных мацнейшай партыі сталіцы. Тыя, хто спадзяюцца ламаць растучае супраціўленьне пралетарскіх мас супроць фашысцкай дыктатуры забаронамі пралетарскага друку, глыбока памыляюцца. 860 тыс. пралетарскіх выбаршчыкаў нельга забараніць».

Забаронена таксама на два тыдні пралетарская **«Арбэйтэр Ілюстрыртэр Цэйтунг».** Газэта забаронена за надрукаваньне вершу Вейнэрта, у якім усьлядаецца зьнявага рэйхсвэру.

У памяшканьні марксыцкага рабочага унівэрсытэту паліцыяй зроблен 2-х гадзінны вобыск. Пасьля гэтай бярэзультатнага вобыску паліцыя арыштавала 11 чалавек, у тым ліку вядомага пісьменьніка **Людвіга Рэна.** Многіх з арыштаваных паліцыя, аднак, выгушчала была хутка вызваліць.

Кампартыя атрымала яшчэ адзін дэпутацкі мандат

БЭРЛІН, 25. У рэзультаце праверкі выбараў у Дзюсэльдорфскай акрузе выявілася, што кампартыя мае яшчэ адзін мандат. Такім чынам лік дэпутатаў у новай камфракцыі рэйхстагу даходзіць да 101.

Бурныя дэманстрацыі супроць фашысцкай дыктатуры

БЭРЛІН, 25. Учора ўвечары ў **шасьці раёнах Бэрліну** зноў адбываліся шматлюдныя рабочыя дэманстрацыі супроць фашысцкай дыктатуры і са скасаваньне кары сьмерці рабочаму Бартлю. У **Шпандау** ў часе сутычкі дэманстрантаў з паліцыяй паранены адзін паліцэйскі і адзін рабочы. Такія-ж дэманстрацыі адбываліся ў **Хэмніцы.** Як паведамляе буржуазны друк, дэманстрацыі ў некаторых раёнах гораду прымалі пагражаючы характар, у сувязі з чым былі выкліканы ўзмоцненыя атрады паліцыі. Адбыўся рад сутычак, Арыштавана некалькі рабочых.

ІНТЭРВ'Ю КАРЭСПАНДЭНТА ТАСС З ПОЛЬСКІМ МІНІСТРАМ ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ БЭКАМ

ЖЭНЭВА, 26. (Спэц. кар. ТАСС). Учора ў часе пасяджэньня рады Лігі нацый карэспандэнт ТАСС быў прадстаўлен польскаму міністру замежных спраў п. Бэку, які ветлі ва дазволіў яму перадаць савецкай прэсе наступную заяву:

«Я з вялікім задавальненьнем магу сказаць вам, што разьвітаньні падпісаны толькі што і прадугледжаны ў нашым пакце дагавор аб унагаджальнай працэдуры, як вельмі сьпімтаматычны і рэальны крок для Польшчы і СССР. Я думаю, што ён у шырокай ступені будзе дапамагаць ня толькі яшчэ большаму паляпшэньню стану розумаў у СССР і ў нас, але і стабілізацыі сапраўды добрасуседзкіх адносін паміж нашымі краінамі. Я надаю актам, падпісаным паміж Польшчай і СССР, яшчэ больш глыбокае значэньне, якое выходзіць за рамкі нашых узаемных адносін. Мы дабіліся добрага рэзультату, бо вялі перагаворы ў духу ўзаемнай добрай волі і з шаданьнем аднаходзіць нешта рэальнае. У смутную эпоху, якую мы перажываем, мы такім чынам далі прыклад адзінага мэтаду, здольнага паменшыць тое, што надыяе сьвет, і разьвіць тое, што яго злучае. Я шкадую толькі аб адным, з іменна, што будучы затрымаў справамі меншага значэньня ў Жэнэве, я ня мог прыняць удзелу непасрэдна ў Варшаве ў заключных работах, якія вядуць да ратыфікацыі нашай згоды».

ПАСТАНОВА ЦК УсеКП(б)

1. За ашуканьне партыі, якое выявілася ў прадстаўленьні заведама ілжывых даных, зьмяншаючых збожжавыя рэсурсы збожжасаўгасаў, — выключыць з партыі дырэктара Украіна-Крымскага збожжатрэсту Буркова.

2. Давяраць Наркамсаўгасаў даць Буркову ў выглядзе выпрабаваньня работу ў якасьці дырэктара аднаго з саўгасаў.

3. Дапусьціць падачу Бурковым праз год заявы аб прыняцьці зноў у партыю.

ЦК УсеКП(б).

25 лістапада, 1932 г.

ПАСТАНОВА

сакратарыяту ЦК КП(б)Б па справе адстраненьня ад працы тав. Дзічкоўскага намесьнікам упаўнаважанага Наркамцяжпраму тав. Сакаленка ад 10-XI 1932 г.

Заслухаўшы вывады камісіі па расьсьледваньні справы адстраненьня ад працы дырэктара заводу імя Варашылава т. Дзічкоўскага, сакратарыят ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Загад т. Сакаленкі ад 3 лістапада г. г. аб адстраненьні ад работы без рашэньня ЦК і гаркому партыі дырэктара заводу імя Варашылава т. Дзічкоўскага, які зьяўляецца членам ЦК партыі і членам бюро гаркому КП(б)Б, — лічыць арганізацыйна няправільным, за што ўказаць т. Сакаленку.

2. Тав. Дзічкоўскаму за парушэньне прынцыпаў адзіначальня абвясьціць суровую вымову.

3. Даручыць бюро парт'ячэйкі заводу імя Варашылава растлумачыць і прапрацаваць гэтае рашэньне сакратарыяту на ячэйцы.

4. Аддзелу кадраў ЦК КП(б)Б, разам з т. Сакаленка, у 3-дзённы тэрмін узмацніць Белметалзбудпрацы работчыкамі.

Менскаму гаркому КП(б)Б зараз-жа самандыраваць на работу ў Белметалзбудпрацы тав. Айзмана.

АБМЕН ВОПЫТАМ ПАМІЖ БАРЫСАЎСКАЙ І БАБРУЙСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯМІ

Задача барысаўскай партарганізацыі—шырэй разьвіць бальшавіцкую работу ў масах, лепш кіраваць нізавымі партыйнымі зьвеньнямі

У авангардзе мас

У першым квартале бягучага году прадукцыйнасьць працы на лесапільным заводзе імя Розы Люксэмбург стаяла на вельмі нізкім узроўні. Прамфінплян выконваўся толькі на 60-70 проц. Партыйная ячэйка не змагалася за ўмацаваньне прапоўнай дысцыпліны, стаяла ў баку ад задач рэалізацыі 6 умоў тов. Сталіна. Кіраўніцтва парт'ячэйкі патурала расхлябанасьці, паказала сваю няздольнасьць мабілізаваць камуністаў і рабочыя масы на выкананьне вытворчых задач.

Паводле пастановы райкому КП(б)Б у красавіку было распушчана бюро парт'ячэйкі. Для аздараўленьня становішча на заводзе і наладжаньня партыйна-масавай работы пасланы ў ячэйку больш моцныя партыйцы з іншых прадпрыемстваў.

Новае кіраўніцтва ячэйкі ў першую чаргу ўзялося за правільную расстаноўку партыйных сіл, за павышэньне ідэалёгічнай устойлівасьці і авангардной ролі камуністаў. Вытворчыя брыгады былі ўзначалены камуністамі і лепшымі ўдарнікамі — беспартыйнымі рабочымі.

Усе вагары грамадзкай узьдзейнасьці былі накіраваны на павышэньне прадоўнай дысцыпліны. Вялікая ўвага аддана разгортваньню вышэйшых форм сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Першымі былі пераведзены на гаспадарчы разрахунак брыгады, на чале якіх сталі камуністы т. т. **Жалкевіч, Ржавуцкі і Мардасаў.**

За першыя месяцы працы на гаспадарчым разрахунку гэтыя брыгады далі па 500-600 руб. эканоміі кожная. Сыстэматычна яны перавыконваюць вытворчае заданьне. За лік гэтай эканоміі брыгады заміяваны на суму звыш 1.000 руб.

Шырокае разгортваньне масава-палітычнай работы на прадпрыемствах, штодзенная ўвага і клопаты заводакіраўніцтва і парт'ячэйкі аб паляпшэньні матар'яльна-бытавых умоў рабочых забясьпечылі значнае ўмацаненьне працдысцыпліны і прадукцыйнасьці працы. Цікучасьць рабочай сілы ў другім паўгодзьдзі ў параўнаньні з першым зьменшылася больш чым у 3 разы, прагулы зьменшаны ў 2,5 разы. Зараз завод поўнасьцю ўкамплектаван рабочай сілай. Колькасьць ударнікаў за апошнія 2-3 месяцы павялічылася на 30 проц.

Усямерна заахвочваючы перадавых барацьбітоў за прамфінплян—лепшых ударнікаў, парт'ячэйка настойліва змагалася з ілжэўдарніцтвам і, у першую чаргу, сярод камуністаў. Камуніст **Гольман** нядбайна адносіўся да свайго варштату, часта пакідаў яго пасьля працы незмазаным. За гэта Гольман прыцягнут да партыйнай адказнасьці і зьнят з работы. Таксама прыцягнут да партадказнасьці Зябкін і Лукаш за нядбайнасьць у рамонце катла. Такім чынам, мэтадамі выхаваньня і партыйнай узьдзейнасьці ячэйка дабілася ўзорнай работы камуністаў на вытворчасьці. Па іх раўняюцца беспартыйныя рабочыя.

Правільнай пастаноўкай работы ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі і задачамі, бальшавіцкай мабілізацыяй рабочых мас на барацьбу за прамфінплян забясьпечаны ня толькі ліквідацыя дапушчанага ў першым квартале адставаньня, але і перавыкананьне прамфінпляну, як па колькасных, так і па якасных паказальніках.

За 10 месяцаў прамфінплян па расьпілоўцы сырцу выкананы на 105 проц. і па выхаду піламатар'ялу—на 110,9 проц. Работа ў лістападзе праходзіць яшчэ больш павышанымі тэмпамі. За першую палову месяца вытворчае заданьне выкананa на 118,4 проц. Кіраўніцтва заводу і ўвесь заводзкі калектыў змагаюцца за датэрміновае выкананьне прамфінпляну чацьвертага заключнага году пяцігодкі. Няма сумненьня, што пры бальшавіцкай пастаноўцы работы гэта задача будзе выкананa з гонарам.

Я. А.

Так трэба перабудоўвацца

Партыйная група **Файфура** арганізавалася ў сярэдзіне 1931 г. Яна была створана ў той час, калі партмасавая работа на «Домбалі» толькі пачала перабудоўвацца.

Група складалася з трох членаў і двух кандыдатаў партыі. Партнагрузку разьмеркавалі з такім разьлікам, каб кожны партыец адказваў за пэўны участак работы.

Гэтага прынцыпу разьмеркаваньня нагрузак прытрымліваецца партгрупа і зараз. Адзін адказвае за правядзеньне партыйнай вучобы. У яго абавязак уваходзіць забясьпячэньне ў дні заняткаў поўнай явкі партыйцаў, камсамольцаў. Ён павінен дагаварвацца з культпропам калектыву аб месцы заняткаў, падручніках і г. д.

Другі партыец—групавы агітатар. Гэта яго асноўная нагрузка. Ён праводзіць з рабочымі гутаркі на агульна-палітычныя тэмы, чытае газэты і г. д. Важнейшыя пастановы партыі і ўраду папулярызуюцца сярод камуністаў і беспартыйных рабочых групавым агітатарам.

Так разьмяркоўваліся і іншыя нагрузкі.

Дзякуючы правядзеньню вялікай палітвыхаваўчай работы партыйная група нясуцыпн на расла.

Неўзабаве два члены партыі гэтай групы т. **Сьцяпанаў** і групорг тав. **Кабанаў** былі вылучаны на адказную работу: Сьцяпанаў—старшынёю ЗРК, Кабанаў—загадчыкам заводзкай ашчадкасы.

Аднак, работа не аслаблялася. Іх замянялі яшчэ зусім маладыя члены партыі—учарайшыя кандыдаты.

Партыйная група тав. Файфура асабліва вырасла за апошні месяц. У часе сьвята 15-й гадавіны Кастрычніка 7 лепшых ударнікаў зьмены, рабочыя з 20 і 30-гадовымі стажамі ўступілі ў партыю.

Перад партыйнай групай паўстала сур'ёзная і адказная задача—наладзіць выхаваўчую работу, замацаваць прыліў. Адказным за правядзеньне вучобы вылучан адзін з лепшых партыйцаў-ударнікаў тав. **Казыра.** Групавым агітатарам партгрупа аднагалосна выбрала тав. Кузьміча—старога рабочага з 29 гадовым стажам, нядаўна ўступіўшага ў партыю.

Вучоба з кандыдатамі праводзіцца два разы ў тыдзень—па аўторакам і пятніцам. Пакой, дзе праводзіцца заняткі заўсёды перапоўнены партыйцамі, камсамольцамі і беспартыйнымі рабочымі зьмены.

Рэгулярна склікаюцца сходы партгрупы, на якіх ставяцца важнейшыя вытворчыя і іншыя хвалюючыя партыйцаў пытаньні.

Сходы партгрупы Файфура адыгрываюць вялікую ролю ў выхаваньні новага папаўненьня, бо яны заўсёды носяць сур'ёзны і дзелавы характар.

Парторг тав. Файфура тлумачыць пасьля ховае правядзеньне сходаў тым, што да іх праводзіцца добрая падрыхтоўка. Рыхтуецца ня толькі адзін даклядчык, але ўсе партыйцы.

Ажыўленасьць, шматлікія спрэчкі, сур'ёзнае абгаварэньне пытаньняў, кашкрэтныя пастановы— характэрныя рысы сходаў партгруп Файфура.

Узяць хоць-бы апошні сход. На гэтым сходзе група абмеркавала дэкрэт ураду аб прагульшчыках. Групавому агітатару тав. Кузьмічу было даручана растлумачыць пастанову беспартыйным рабочым зьмены. На другі дзень у часе абедзенага перапынку тав. Кузьміч правёў гутарку з беспартыйнымі рабочымі аб сутнасьці і значэньні пастановы ўраду аб прагульшчыках. У гэты-ж дзень быў склікан агульны сход рабочых зьмены, на якім абгаворана пастанова.

Тав. ФАЙФУРА — парторг зьмены. (Завод імя Домбаля).

На другі-ж дзень пасьля сходу самыя злосныя прагульшчыкі зьявіліся на работу.

Зьявіўся **Шумякоўскі,** які ўжо тыдзень гуляў бяз уважлівых прычын, зьявіліся прагульшчыкі **Падалянчык, Сахончык** і інш.

Роля камуністаў у выкананьні пляну ўсёй зьмены красамоўна характарызуецца вытворчымі паказальнікамі.

Тав. **Фінка**—малады кандыдат партыі. Ён некалькі раз прэміяваўся. Сыстэматычна перавыконвае плян. Ня мае ні аднаго прагулу.

Тав. **Вінцік**—кандыдат партыі. Таксама не калькі разоў прэміяваўся. Сыстэматычна перавыконвае плян на 13-15 проц.

Асабліва адзначаецца групавы агітатар тав. **Кузьміч.** Старыч, (як яго называюць рабочыя)—выконвае плян на 144 проц.

Партыйная група тав. Файфура сваёй работай дабілася таго, што зьмена выканала плян за кастрычнік на 102 проц.

Работа партгрупы тав. Файфура вучыць, як трэба перабудоўвацца.

ШМІДТ.

Палепшыць якасьць партыйнага дня

У пастаноўцы ўнутрыпартыйнай работы і павышэньні авангарднай ролі камуністаў на вытворчасьці больш дадатныя паказалі нікамі ў калектыве фабрыкі «Пралетарская перамога» адзначаецца ячэйка першай зьмены. Кіраўніцтва гэтай ячэйкі на чале з сакратаром тав. **Мазуркевіч** сканцэнтравала сваю ўвагу на павышэньні актыўнасьці камуністаў і ахопу партыйным уплывам рабочых зьмены. У гэтых адносінах вялікую ролю адыграла барацьба ячэйкі за павышэньне якасьці партдня.

У ячэйцы рэгулярна праводзяцца два партсходы ў месяц. Да кожнага дня ў цэхах шырока разгортваецца падрыхтоўчая работа. У парадак дня высоўваюцца актуальнейшыя пытаньні вытворчага і ўнутрыпартыйнага жыцьця.

За апошнія тры месяцы на сходах ячэйкі абмеркаваны пастановы пленумаў ЦК КП(б)Б, ЦК УсеКП(б) і XII пленуму ВКК. Абмеркавана 7 пытаньняў вытворчага характару: перадавы артыкул «Зьвязды» «Бальшавікі Барысаўшчыны ў авангардзе барацьбы за прамфінплян», ход выкананьня прамфінпляну за месяц, аб працдысцыпліне, сацспаборніцтве і г. д.

Побач з прапрацоўкай чарговых мерапрыемстваў партыі і канкрэтных пытаньняў вытворчасьці, за апошні час у большай меры ячэйка ставіць на абмеркаваньне свайго сходу пытаньні ўнутрыпартыйнага жыцьця, як рост партыі, работа з кандыдатамі, партвучоба і інш.

Парадак дня, час і месца сходу заўсёды шырока абвяшчаюцца ў зьмене. Гэта спрыяла павялічэньню наведваньня партсходаў, асабліва беспартыйнымі рабочымі. У сярэднім наведвае кожны партсход 40-45 беспартыйных рабочых. Наведваньне камуністамі партдня нельга прызнаць яшчэ здавальняючым, яно дасягае і зараз ня больш 65 проц. Не наведваюць сходаў ячэйкі пераважна прымацаваныя партыйцы. Напрыклад, тав. **Салазей** з 10 сходаў наведаў толькі 3, тав. **Медзяльянава** тры месяцы не наведвае сходаў ячэйкі, тав. **Жукоўскі** з ліпеня і да гэтага часу прысутнічаў толькі на адным партсходзе.

Няправільна робіць кіраўніцтва ячэйкі, калі ня рэагуе на гэтыя факты парушэньня партыйнай дысцыпліны. Нават уведўшы ў практыку сыстэматычнае падагульваньне вынікаў партдня, высьвятленьня прычыны ненаведваньня сходаў паасобнымі партыйцамі—ушчэпкаецца кіраўніцтвам парт'ячэйкі з пад увагі.

Сакратар ячэйкі тав. Мазуркевіч як-бы ў апраўданьне заяўляе:

— Медзяльянава—інвалід працы, жыве далёка. Праўда, наведваць сходы яна можа, але чаму ня ходзіць ня ведаю; Жукоўскі—стары, ён хоць і ня бывае на сходах нашай ячэйкі, дык іншы раз наведвае сходы ячэек другіх зьмен.

У адносінах іншых ненаведваючых сходы «прычын» няма.

Кіраўніцтву ячэйкі пара зразумець, што наведваньне сходаў—гэта ня простая фармальнасьць, а партыйны абавязак кожнага камуніста. **Выхоўваць членаў ячэйкі ў духу бальшавіцкай партыйнасьці — важнейшая задача кіраўніцтва.**

Ня гледзячы на наяўнасьць яшчэ даволі істотных недахопаў у правядзеньні партдня, усё-ж ячэйка 1-й зьмены дасягнула значнага павышэньня ролі партсходу, як важнейшага вагару ўнутрыпартыйнай выхаваўчай работы. Партыйцы пасьля сходу атрымліваюць моцную зарадку для далейшай работы на вытворчасьці.

Змагаючыся за павышэньне авангарднай ролі камуністаў, парт'ячэйка рашуча рэагуе на ўсякія малейшыя парушэньні прадоўнай дысцыпліны. Быў выпадак, калі асобныя партыйцы па-хвасьцісцку адносіліся да парушэньняў працоўнай дысцыпліны. Гэты выпадак свячасова пастаўлен на абмеркаваньне нечарговага закрытага сходу ячэйкі. Канкрэтныя вінаватыя—кандыдаты партыі Пучкова і Краснова—прыцягнуты да партыйнай адказнасьці.

26 партыйцаў, якія працуюць непасрэдна ля варштату, усе ўдарнікі. Найдарніцай лічыцца толькі адна т. **Сафончык,** нядаўна пераведзеная на працу ў першую зьмену. Усе камуністы зьяўляюцца застрэльшчыкамі і арганізатарамі сацыялістычных мэтадаў працы, паказваюць прыклады працоўнай дысцыпліны на вытворчасьці. Гэта значна павысіла аўтарытэт ячэйкі сярод беспартыйных. Напярэдадні 15 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі 8 перадавых рабочых і работніц падалі заявы аб прыёме ў партыю.

Адна з важнейшых задач у далейшай работе ячэйкі—наладзіць сыстэматычную праверку выкананьня сваіх пастаноў, уцягнуць усіх партыйцаў, асабліва кандыдатаў у школы, павышаючы гэтым іх ролю ў палітычным і вытворчым жыцьці прадпрыемства.

Н. Бор.

Пераходны сьцяг у няіснуючай партгрупе

Партгрупа тав. Савэльзон (фанэрны завод) складаецца з 12 чалавек, якія працуюць у шчапальным, перасовачным, сушыльным і выпальваючым адзяленьнях. Ва ўмовах такой распыленасьці, пры адсутнасьці належнага інструктажу ў рабоце, гэта партгрупа доўгі час нічога не рабіла, бо парторг ня ведаў функцый і задач групы.

Парэшце, пры дапамозе бюро ячэйкі, агульнымі намаганьнямі партгрупа «знайшла» сваё месца, правы і абавязкі ў рабоце. Хоць і рэдка, але праводзіліся сходы групы, на іх абмяркоўваліся пытаньні вытворчасьці і выкачаліся канкрэтныя задачы работы на пэўны адрэзак часу. Большасьць партыйцаў гэтай групы—т. т. Аляксейчык, Макавецкая, Ласіцкі і інш. праводзілі вялікую палітычную работу ў цэхах.

Гэта партгрупа першай на заводзе арганізавала газэту-штодзенку, праз якую змагалася за павышэньне прадукцыйнасьці працы, мабілізавала рабочых на выкананьне прамфінпляну.

Партгрупа праявіла ініцыятыву і настойлівасьць у пастаноўцы перад кіраўніцтвам заводу пытаньня аб арганізацыі сваёй сталоўкі. Практычнае вырашэньне гэтага пытаньня дало значную эканомію рабочага часу.

У вольны час абедзеннага перапынку партгрупа праводзіла палітычна-выхаваўчую работу сярод мас і гэтым самым забясьпечыла рост ударніцкага руху. Брыгады, якія абслугоўваліся гэтай партгрупай, з месяца ў месяц перавыконвалі вытворчае заданьне.

Улічваючы станоўчыя рэзультаты работы, раённая конкурсная камісія прысудзіла гэтай групе першую прэмію—пераходны сьцяг райкому КП(б)Б.

Заваяваўшы пярэшынства, партгрупа крыха-па-крысе пачала аслабляць сваю работу. Прычынай паслужыла тое, што групапарторг перакінут быў кіраўніцтвам ячэйкі заводу ва ўцільцэх для работы па сумяшчальнасьці. Доказы нямэтазгоднасьці такіх перакідак не пераканалі сакратара парт'ячэйкі т. **Фірага.** Ён заяўляе:

— Нічога, справішся і на двох франтох.

Сакратарскі аптымізм так і застаўся аптымізмам. Партгрупа спыніла сваю работу. Ужо два месяцы не праводзяцца сходы і наогул няма ніякіх адзнак існаваньня гэтай партгрупы.

Зараз на радзе прадпрыемстваў ёсьць партгрупы, якія ўзорна працуюць і маюць багаты вопыт у формах і мэтадах сваёй работы.

Пераходны сьцяг РК КП(б)Б ня можа далей знаходзіцца ў тэй партгрупе, якая фактычна распалася. Аб гэтым пара ведаць партакіраўніцтву раёну і камбінату.

Л. Б.

Групавыя агітатары па сьпісу

У мэтах найшырэйшага разгортваньня агітацыйна-масавай работы на прадпрыемствах; ЦК КП(б)Б вынес спэцыяльную пастанову аб вылучэньні групавых агітатараў і стварэньні пры ячэйках агітколектываў.

Аднак, гэта важнейшае мерапрыемства ў сыстэме перабудовы партработы на вытворчасьці, не знайшло належнага аллюстраваньня ў практыцы многіх парт'ячэек Барысаўшчыны. Да гэтага часу ўсё яшчэ «праходзіць» стварэньне агітколектываў. На прадпрыемствах толькі прыступаюць да разгортваньня групавой агітацыі.

Ярыя прыклад у гэтых адносінах —камбінат «Камінтэрн». Там з фармальнага боку ўсё ў парадку. Сакратар парткалектыву тав. Барзінаў паказвае надрукаваны сьпіс вылучаных групагітатараў. Сьпіс і толькі. Вылучаныя агітатары нічога ня робяць. Ня робяць і ня ведаюць, што рабіць. Іх ня склікалі і не інструктавалі.

Ня дзіва, што

— і рад-бы працаваць, але ня ведаю, з чаго пачынаць—заяўляе групагітатар мэблевага цэху тав. Салавейчык.

Да стварэньня агітколектываў паасобныя парт'ячэйкі падыходзілі фармальна. Вылучалі часта тых партыйцаў, якія дагэтуль ня несьлі ніякіх нагрузак у ячэйцы.

— Як вы, тав. Шумчанка, спраўляецеся са сваімі абавязкамі групавога агітатара?

— А хто мяне вылучаў па гэту работу?

Аказваецца, што ячэйка нават не пазнамяла таварышоў аб вылучэньні іх групавымі агітатарамі.

Гр. Кугель.

Гаспразрахунковая брыгада Кузьміна, якая выконвае прамфінплян на 154 проц. (Завод імя Домбаля).

Я. Івашын

ЛЕПШ КІРАВАЦЬ ЦЭХ'ЯЧЭЙКАЙ І ПАРТГРУПАЙ

На прадпрыемствах Барысаўшчыны зараз налічваецца звыш 14 тыс. рабочых, супроць 3.500 у 1928 годзе. Простым супастаўленьнем гэтых дзьвёх лічбаў ужо акрэсьліваецца факт вялізарнейшай палітычнай важнасьці. Гэтыя лічбы вельмі перакавачна ілюструюць гіганцкі размах разьвіцьця прамысловасьці гораду і буйны рост рабочай клясы за апошнія гады, гады ўпартай бальшавіцкай барацьбы за пяцігодку.

Шпаркі рост рабочай клясы перапажна за лік прышоўшых з вёскі, павышае задачы партарганізацыі.

Ахапіць поўнасьцю рабочых штодзённай палітычна-масавай работай і партыйным уплывам, выхоўваць у маладых кадраў сапраўдныя сацыялістычныя адносіны да працы можна толькі на аснове перабудовы ўсёй работы ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі і задачамі. Трэба перабудаваць партыйна-масавую работу так, каб «быць на вышыні стаячых перад намі задач—кіраўніцтва масамі і арганізацыі іх вакол лёзунгаў партыі на барацьбу за іх ажыцьцяўленьне» (Кагановіч).

Важнейшым сродкам партыйнай узьдзейнасьці на масы зьяўляецца правільная расстаноўка партсіл, пераняцьцяньне цэнтру цяжару партыйна-масавай работы ў нізавое зьвяно—цэх, брыгаду, дэтальнае вывучэньне складу работы і дыферэнцыяваны падыход да розных груп і пластоў рабочых за ўсёй сыстэме выхаваўчай работы.

У адпаведнасьці з гэтым вытворчыя парткалектывы і ячэйкі Барысава ў асноўным правялі арганізацыйную перабудову сваёй работы. Па 3-х буйнейшых прадпрыемствах (Бялезінскі камбінат, камбінат імя Камінтэрну, і завод імя Домбаля) з агульнай колькасьці партыйцаў у 510 чалавек арганізавана восем зьменных парт'ячэек, 13 цэхавых і 47 партгруп. Зараз, як правіла, на кожным вядучым цэху партыйная праслойка большая, чым у астатніх. У парткомах пакінута ня больш 2 кіруючых работнікаў, астатнія пасланы ў нізавое партзьвяно. На паасобных прадпрыемствах, у прыватнасьці на заводзе імя Домбаля значна палепшаны інструктаж партячэек і групарторгаў. Там ёсьць даволі ўзорныя прыклады работы раду партгруп.

Вялікая ўвага аддаецца партарганізацыяй разьвіцьцю сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Зараз па гаспадарчым разрахунку працуе 66 брыгад з колькасьцю 506 рабочых. Брыгады ўвялі ў сыстэму зьменна-сустрочнае планаваньне.

Правільнай пастаноўкай партыйна-масавай работы на заводзе забясьпечаны даволі паказальныя вытворчыя перамогі. Прамфінплян на гэтым прадпрыемстве на 1 лістапада выкананa на 105,5 проц.

Значна горш стаіць справа на камбінаце «Камінтэрн». Былое кіраўніцтва парткалектыву недаацэньвала важнасьці масавай работы ў нізавых зьвеньнях. У арганізацыйнай набудове парт. і прафсаюзных органаў там былі такія разыходжаньні, якія не давалі магчымасьці цесна ўвязаць работу трыкутнікаў.

Пасьля адпаўленьня парткіраўніцтва зроблены ўжо значныя крокі наперад па перабудове арганізацыйна-партыйнай і масавай работы ў цэху (лесапільны і калодачны цэхі). За 10 месяцаў вытворчае заданьне лесапільным цэхам выкананa на 98,3 проц., калодачным на 98,8 проц. Толькі мэблевы цэх топчыцца на месцы, не падымаючыся вышэй 40 проц. Кіраўніцтва цэху апраўдваецца аб'ектыўнымі прычынамі—дрэнная праяўсной здольнасьцю сушылкі і ў той-жа час нічога ня ўжывае для ліквідацыі адставаньня цэху.

Задача парткалектыву камбінату—сканцэнтраваць увагу на вузкае месца працы, узмацніць барацьбу з усялякімі праяўленьнямі дэмабілізацыйных настрояў і аканрэтнічкай практыкі.

Трэба добра ўсьвядоміць, што несвяячасовае рэагаваньне на ўсё тое, што на першы погляд здаецца дробязьзю прыводзіць да расхлябанасьці, дае вытворчасьці вялікія праграхі, якія потым ужо ратаць вельмі цяжка.

Навучальным урокам у гэтых адносінах зьяўляецца тое становішча, якое дапушчана на фабрыцы «Пралетарская перамога». Фабрыка ў першым паўгодзьдзі стаяла ў перадавых радох барацьбітоў за прамфінплян па ўсёй запалкавай прамысловасьці. Там ня мала было прыкладаў узорнай пастаноўкі работы партячэек і груп, сыстэматычна праводзілася масавая палітычная работа ў цэхах і брыгадах. Дзякуючы гэтаму «Пралетарская перамога» перавыканала вытворчую праграму за першае паўгодзьдзе па ўсіх паказальніках.

Але, дасягнуўшы вытворчых посьпехаў, партыйная арганізацыя фабрыкі аслабіла сваю работу і ўвагу да бытавых штодзённых запатрабаваньняў рабочых: то вады ў цэху не аказалася, то абед у сталоўцы сапсуюць і рад іншых недахопаў бытавога парадку ўсё чысьцей сталі паўтарацца. Бясьпечасьць кіраўніцтва фабрыкі да ліквідацыі гэтых недахопаў прыняла да павышэньня цікучасьці рабочай сілы. Партыйная арганізацыя не ўзяла на належную палітычную вышыню барацьбу за паляпшэньне матар'яльна-бытавых умоў рабочых. У выніку, калі ў першым паўгодзьдзі зволілася з фабрыкі 399 ч., дык за тры наступных месяцы колькасьць ушоўшых з прадпрыемства дасягнула 698 чал.

Арганізаванага набору рабочых не праводзілася. Самацёчны прыход па фабрыку новых рабочых не запаўняў месца ўшоўшых. Таму зараз на фабрыцы не хапае больш 300 чалавек рабочых.

Перадавыя барацьбіты за прамфінплян, лепшыя ўдарнікі не карысталіся заслужанымі прывілеямі на прадпрыемстве. Пачалі расцадацца гаспадарча-разрахунковыя брыгады—з 28 раней існаваўшых брыгад засталося у перасьні толькі 15. Усё гэта рэзка адбілася на вытворчай рабоце. Прамфінплян па фабрыцы зараз выконваецца толькі на 70-73 проц.

Раённы камітэт партыі, аналізуючы становішча «Пралетарскай перамогі», адзначыў «рэзкае аслабленьне кіраўніцтва прадпрыемствам, аслабленьне партыйнай, прафсаюзнай і камсамольскай работы па мабілізацыі камуністаў і рабочых мас на барацьбу за выкананьне вытворчай праграмы».

Для ліквідацыі дапушчанага адставаньня накіравана да варштату 20 кваліфікаваных работнікаў, якія працавалі ў кіруючых органах фабрыкі. Вылучана ў дапамогу партарганізацыі брыгада з кіруючых работнікаў райвегту. Перагледжана кіруючы склад цэхаў і камітэт яго ўмацаваньня. Вызначан рад канкрэтных мерапрыемстваў па паляпшэньні матар'яльна-бытавых умоў рабочых. Поўнай рэалізацыя пастановы райкому павінна забясьпечыць фабрыцы баяздольнасьць — цавала раней.

Прагулы і цікучасьць рабочай сілы—асноўная перашкода ў выкананьні прамфінпляну і па іншых прадпрыемствах. Пастановы ЦВК і СНК СССР аб прагулах зьяўляецца на гутным вагаром умацаваньня працоўнай дысцыпліны. Трэба перайсьці ад простай рэгістрацыі фактаў прагулаў да канкрэтнай дзейснай барацьбы з гэтым гаўебным зьявішчам. Кожны выпадак звальненьня за прагул павінен суправаджацца шырока разгорнутай масавай работай, баявой мабілізацыяй пралетарскай грамадзкасьці на барацьбу з сымулянтамі, прагульшчыкамі і лятунамі. Справа гонару кожнай партыйнай ячэйкі на вытворчасьці—дабіцца ў бліжэйшы час поўнага зьнічэньня прагулаў і спыненьня цікучасьці рабочай сілы.

Змагаючыся за ўмацаваньне працоўнай дысцыпліны, падпарадкуючы гэтай справе ўсе формы і мэтады масавай работы, трэба ўжываць разам з тым усе захады для далейшага паляпшэньня матар'яльна-бытавых умоў рабочых. Карэнная задача перабудовы партработы на вытворчасьці — павысіць ролю партыйнай ячэйкі як «кіраўніка грамадзка-палітычнага жыцьця, партыйнай работы, агульна-гаспадарчых мерапрыемстваў, што праводзяцца на заводзе, і як арганізатара барацьбы за паляпшэньне быту рабочых і лепшай пастаноўкі рабочага забясьпячэньня...» (З пастановы ЦК УсеКП(б) ад 7 жніўня).

У сыстэме перабудовы арганізацыйна-партыйнай і масавай работы вельмі важнае значэньне набывае пытаньне падрыхтоўкі кіруючых партыйных кадраў. Сакратарскі склад цэхавых і зьменных парт'ячэек па барысаўскіх прадпрыемствах у сваёй большасьці малады па партстажы. Многія сакратары ячэек ня маюць элемэнтарнай падрыхтоўкі. Адсюль і значная дзікасьці ў выкананьні задач пляпшэньня зьместу, форм і мэтадаў палітычнай і выхаваўчай работы па прадпрыемствах.

Характэрны такія прыклады. Адзін з сакратароў цэхячэек заводу імя Домбаля, добры партыец, маснік, ініцыятыўны таварыш, шчыра і адкрыта заяўляе: «Мае сябры 15 гадзін бесьперапынна працаваць ля варштату, чым падрыхтавацца да дакладу. Хачу, каб добра было, але шяк ня выходзіць, таму, што слаба разьбіраюся ў палітычных пытаньнях».

На «Пралетарскай перамозе» сакратар зьменнай ячэйкі, у якой больш менш здавальняюча пастаўлена работа ў гутарцы аб партдні таксама гаворыць: «У пастановах сходу ячэйкі мы тэарытычныя пытаньні не закрываем таму, каб не нарабіць палітычных памылак».

Гэтыя дзьве заявы гаворыць аб адным—аб нізкім палітычным узроўні значнай часткі сакратароў партячэек. Таму неабходна ў бліжэйшы час вельмі сур'ёзна заняцца падрыхтоўкай і перападрыхтоўкай партыйных кадраў нізавых зьвеньняў шляхам арганізацыі курсаў, сэмінараў і г. д. Гэта рашаючае зьвяно работы.

Разам з тым і парткалектыву і райкому КП(б)Б трэба дабіцца карэннага паляпшэньня работы сеткі партасьветы, больш увагі ўшы яе з канкрэтнымі задачамі прадпрыемстваў.

Райком партыі зараз прыступіў да праверкі выкананьня дырэктыў аб перабудове арганізацыйна-партыйнай і масавай работы на прадпрыемствах. Праверка павінна паслужыць магутным вагаром у справе хутчайшага завяршэньня перабудовы работы. Неабходна забясьпечыць глыбіню гэтай перабудовы, умацаваньне сярэдніх і нізавых партзьвеньняў.

Сутнасьць перабудовы заключаецца ня толькі ў арганізацыйных мерапрыемствах.

Узяць усю масавую, палітычную работу на вышыню задач сёньняшняга дня можна толькі тады, калі кіраўніцтва рэйнае, калектываў — будзе штодзенна кіраваць сакратарам ячэйкі, парторгам, агітатарам, пачынаючы у іх крапатлівай і такой зараз важнай работе.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Аб справе настаўніцы Афонскай

Пастанова бюро Менскага ГК КП(б)Б ад 25-XI-32 г.

Адзначыць, што з боку былога інспектара гарАНА т. Маеровіч былі праяўлены няправільныя, грубыя і нетактычныя адносіны да тав. Афонскай, якія выразіліся ў ігнараванні яе, у складаныні ёй, як загадчыцы школы пяспрыяючых умоў для працы замест устанаўленыя чулых адносін і аказаньня тав. Афонскай сапраўднай практычнай дапамогі.

Адзначыць беспадстаўнасьць загаду т. Зяньковіча ад 9-га жніўня 1932 г., у якім адзначаецца спышенне рамонту ў 16 школе з-за выезду тав. Афонскай у адпачынак у той час, калі рамонт школы закончылі своечасова і своечасова распачаты заняткі ў школе.

Лічыць няправільным і беспадстаўным аслабаненьне тав. Афонскай ад загадваньня школай і асабліва недапушчальным перавод тав. Афонскай з яе групай вучняў у 27 школу ў часе яе хваробы.

Адзначыць, што з боку парткалектыву і асабліва гаркому саюзу працасьветы праяўлены нячулыя адносіны да тав. Афонскай.

Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што адказныя працаўнікі гарАНА, парткалектыў і прафсаюз у справе тав. Афонскай праявілі неразумешне пастановы ЦК УсеКП(б) аб школе і аб стварэньні ленінскіх адносін да настаўніцтва.

За нячулыя, нетактычныя адносіны да тав. Афонскай, інспэктару гарАНА тав. Маеровіч абвясьціць вымову, а загадчыку гарАНА тав. Зяньковічу паставіць на від.

Прапанаваць тав. Зяньковічу перавесьці тав. Афонскую з сваёй групай вучняў для працы ў 16-ю школу.

Абавязаць гарАНА, парткалектыў і гаркам саюзу працасьветы стварыць у працы тав. Афонскай належныя спрыяючыя ўмовы.

Прапанаваць парткалектыву і гаркому саюзу працасьветы прапрацаваць гэту пастанову на сваіх калектывах і сярод настаўніцтва.

Даручыць гарАНА і культпропу ГК КП(б)Б устанавіць лепшае кіраўніцтва і нагляд за працай школ.

Прыкрываюцца „аб'ектыўнымі" прычынамі

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Трэцяя пяцідзённка дае далейшае зьніжэньне тэмпаў у выпрацоўцы паперы добрускай папяровай фабрыкай «Герой працы». Заданьне ў 456 тон выканана на 39,2 проц. Недадана за 5 дзён 274 тоны паперы.

Нарады на адгрузку паперы для партвыдату на кастрычнік выканаць поўнасьцю. Агіднае становішча з адгрузкай у лістападзе. Адгружана 29.638 кгр. замест 102 тон паводле пляну.

У чым галоўныя прычыны такога адставаньня? Яны крыюцца перш за ўсё у адсутнасьці перабудовы партыйнай, прафсаюзнай і гаспадарчай работы ў цэхах. Шэсьць гістарычных умоў правадыра партыі т. Сталіна яшчэ не знайшлі свайго практычнага праламленьня ў сыстэме кіраўніцтва цэхамі, групамі і брыгадамі. Адсутнічае масавая і выхаваўчая работа сярод рабочых. Партыйныя сходы замяняюць сабой вытворчыя нарады. Цэхавыя партсходы ня выхоўваюць камуністаў і яны часта не зьяўляюцца перадавікамі ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну.

Склад сакратароў парт'ячэек у большасьці малады і ня мае вопыту ў практычнай партрабоце. Гэта пацьвярджаецца тым, што сакратар зьменнай парт'ячэйкі т. Мадзікава на адным з агульных сходаў выступіла з прамовай, у якой патрабавала выплачваць пэнсію рабочым не за працу, а па едакох. Падобнае выступленьне прымусіла партыйны камітэт рэагаваць. Выступленьню тав. Мадзікавай быў дан дашчы адпор.

Вельмі мала зроблена ў перабудове гаспадарчага і тэхнічнага кіраўніцтва фабрыкі. Асобныя кіраўнікі і да гэтага часу не зразумелі значэньня ўказаньня тав. Сталіна аб тым, што «новая абстаноўка патрабуе кіраваць па-новаму».

На фабрыцы няма сырцу. Машыны стаяць з-за недахвату драўнянай масы, у той час, калі свой дрэвамасны завод, які можа даць каля 11 тон прадукцыі ў суткі, дае толькі 4-5 тон. Падобнае становішча зьяўляецца зусім недапушчальным, калі 19 лістапада дрэвамасны завод пры недахвацe другіх відаў матар'ялаў выканаў заданьне на 50 проц., што прывяло да выкананьня заданьня па выпуску паперы на 23,1 проц.

Кіраўнікі аддзелу снабжэньня фабрыкі (загадчык аддзелу снабжэньня Энкель) апраўдваюць прарыў адсутнасьцю сырцу. Між тым у 18 кілёмэтрах ад фабрыкі (г. Гомелю) ляжыць на складах каля 60 вагонаў макулатуры, а каля Менску, на фабрыцы імя Леніна — звыш 200 тон драўнянай масы. Як відаць, аддзел снабжэньня спадзяецца, што матар'ял прыйдзе у парадку самацёку.

Ліст «Правды» (аб фарсаваньні адгрузкі паперы для партпадручнікаў) мабілізаваў рабочы калектыў на выкананьне заданьня. Рабочыя пад кіраўніцтвам сваіх партыйных арганізацый гатовы змагацца за выкананьне заказу. Аднак, гаспадарнікі, якія абавязаны забясьпечыць фабрыку сырцом, невыстарчальна бяруцца за справу. Штомесячна на траціцца на тэлеграмы па лініі аддзелу снабжэньня каля 600 руб., а толку ад гэтага ні на капейку.

Недапушчальна адносіцца да снабжэньня фабрыкі сырцом Белпаператрэст (дырэктар Варухоў). Ён ня можа прымусіць кіраўнікоў падначаленых трэсту фабрык своечасова адгружаць драўнянную масу.

Кіраўнікі трэсту ня ведаюць аб тым, што на фабрыцы «Спартак» па выпрацоўку альбомнай паперы выкарыстоўваецца белая драўнянная маса. Гэта ў той час, калі пры кампазыцыі 20 проц. сурагатаў (мох і інш.) можна было з'эканоміць 5 тон дрэўмасы штодзённа, што павялічыла-б сырцовы баланс добрускай папяровай фабрыкі.

Кіраўнікам трэсту два гады таму назад было відома, што добрускай папяровай фабрыцы патрэбен запасны вал для зьмены дэфэрбронных каменьняў. Аднак, гэта пытаньне ня вырашана і па сёнешні дзень. Пры зьмене дэфэрбронных каменьняў дрэвамасны завод затрымліваецца на 5-6 дзён, што бязумоўна пагаршае прарыў у выкананьні вытворчай праграмы.

У кіраўніцтве Саюзпапераснабзбыту фабрыкай існуе паўнейшая чэхарда. **Загадчык Саюзснабзбыту тав. Крайс піша: «грузіць у першую чаргу паперу партвыдату»**, а яго **намесьнік тав. Стырман піша: «грузіць у апошнюю чаргу»**. Падобны факт камэнтараў не патрабуе.

Саюзпаперснабзбыт ня можа дабіцца таго, каб Палееўскі хімзавод своечасова адгрузіў гліцэрын для вырабу пішчай паперы. Ён павінен у чацьвертым квартале адгрузіць 310 тон гліцэрыну, а адгрузіў толькі 54 тоны. Завод імя Леніна, які знаходзіцца ў распараджэньні «Донсоды», па дагаворы павінен адгрузіць 250 тон соды, а адгрузіў толькі 50 тон.

Вузкім месцам на фабрыцы зьяўляецца апал. Горфавод «Шлях сацыялізму» ў гэтым годзе ня выканаў сваёй вытворчай праграмы. Торфу для поўнага забесьпячэньня фабрыкі ня хопіць. Выхад са становішча можна знайсьці пры ўмове зьменшаньня торфу з дровамі. Рэчыцкі і Мазырскі леспрамгасы павінны даць фабрыцы 27 тыс. куб. дроў; пакуль што пе далі ні аднаго мэтра. Такое становішча пагражае спыненьнем фабрыкі. Аднак, гэта ня трывожыць упаўнаважанага Наркамлесу т. Розіна. Там таксама спакойна, як у Белпаператрэсьце і наркамаце лёгкай прамысловасьці БССР.

На фабрыцы нядаўна зьнята апартуністычнае кіраўніцтва, на чале якога стаяў Калінскі. Гэты апартуніст, які не забясьпечыў кіраўніцтва цэхавымі гаспадарчымі арганізацыямі, змог знайсьці сабе цёплае мястэчка ў апараце Белпаператрэсту.

Новае гаспадарчае кіраўніцтва сур'ёзна бярэцца за справу і яму неабходна дапамога, якая, на жаль, адсутнічае як з боку Саюзпаперснабзбыту, так і з боку Белпаператрэсту і ўпаўнаважанага Наркамлесу. Арганізацыі, якія спажываюць прадукцыю добрускай папяровай фабрыкі, павінны таксама цікавіцца снабжэньнем яе сырцом.

А. Манькоў.

„Каштоўная" рэарганізацыя

(Ліст выхаваўцы)

Наркамасьветы тамусьці захацелася рэарганізаваць барысаўскі піянэрскі дом. Для гэтага парашылі ўсіх дзяцей разьмеркаваць па розных дзіцячых домах Беларусі.

4 кастрычніка гэтага году да нас прыбыла пуцёўка для пасылкі 6 выхаванцаў у рагачоўскі дзіцячы дом. Праз два дні ўсе дзеці рагачоўскім дзіцячым домам былі зьвернуты нам назад. Гэта паездка каштавала **225 руб.**

7 кастрычніка прыбывае другая пуцёўка на пасылку 14 выхаванцаў у чэрыкаўскі дзіцячы дом. Праз 7 дзён і гэтыя дзеці былі вернуты нам. Гэта каштавала **800 руб.**

18 кастрычніка мы атрымліваем трэцюю пуцёўку для накіраваньня 6 выхаванцаў у слуцкі дзіцячы дом. У пуцёўцы ня было ўказана якога ўзросту і з якога канцэнтру патрэбна пасылаць. І калі мы паслалі іх у Слуцак, то праз дзень яны вярнуліся назад. Гэта каштавала **1.200 руб.**

Тады загадчык барысаўскага піянэрдому спэцыяльна выяжджае ў Менск для высьвятленьня гэтай злачынай цеганіны. Работнік прыёмніка пры ЦВК БССР Сяліванаў абяцаў высьветліць і ўладзіць усю гэту справу. Але абяцаньне засталося абяцаньнем. Мы ня ведаем, што нам зараз рабіць. Былы ўзорны дзіцячы дом даведзен да запяваду.

Мальцінскі.

АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» патрабуе ад НКАсьветы БССР тэрміновага сканчэньня цеганіны па справе барысаўскага дзіцячага дому і прыцягненьня вінаватых да адказнасьці

Кампрамэтуюць справу ашчадкас

(Ліст аднаасобніка)

У вёсцы **Лапачэўскі брод, Тальскага сельсавету, Любаньскага раёну**, жыве бядняк **Саковіч Антось**. У яго прапаў конь. І ён парашыў сабраць усе сродкі, каб купіць неабходнага для гаспадаркі каня. Саковіч парашыў прадаць карову.

Пра гэты намер даведаўся старшыня сельсавету і загадвае Саковічу:

— Прадаваць карову не дазваляю.

Гэта адзін з прыкладаў, як **Тальскі** сельсавет зрывае **разгортваньне нашага гандлю.**

У гэтага-ж Саковіча з благаславеньня сельсавету суседнім аднаасобнікам была захоплена паласа зямлі. Падатак за зямлю і загатоўкі сельсавет усклаўдае на... Саковіча. Колькі не хадзіў ён са скаргамі, ніхто яму не дапамог.

Лутовіч Тацьцяна за згарэўшую хату атрымала 600 руб. страхоўкі. Старшыня сельсавету ўгаварыў яе ўнесьці грошы ў ашчадкасу пры сельсавеце. Гэта, вядома, ня дрэнна. Але калі Лутовіч згарэла новую хату і трэба было ўзяць у ашчадкасе грошы для ўплаты, то ёй грошай ня выдалі. Лутовіч ходзіць і просіць аддаць яе грошы.

Тальскія сельсаветчыкі кампрамэтуюць у вачох працоўных справу ашчадкасы.

П. Саковіч.

Бяспрытульны тэхнікум

(Ліст камуністаў, работнікаў яўрэйскага с.-г. тэхнікуму ў Курасоўшчыне)

Яўрэйскі сельска-гаспадарчы тэхнікум у Курасоўшчыне арганізован у 1929 г. На двух яго аддзяленьнях — малочнай жывёлагадоўлі і гародніцтва — зараз займаецца звыш 200 студэнтаў. Тэхнікуму прыходзіцца працаваць у надзвычай цяжкіх умовах. Наркамзем і Белкалгаспцэнтр нічога не зрабілі, каб забясьпечыць яму нармальныя ўмовы для работы. Даволі сказаць, што за тры гады свайго існаваньня тэхнікум пяць гадоў пераяжджаўся з аднаго ведамства ў другое. Атрымалася такое становішча, што навучальная ўстанова амаль увесь час пераходзіць з адных рук у другія, застаючыся бяз усякага кіраўніцтва і дапамогі.

У апошні раз тэхнікум афіцыйна перадан Калгаспцэнтру, фармальна кіруе ім Наркамзем, а фактычна-ж, на справе, і цяпер ніхто ім ня кіруе, ніхто яму не дапамагае.

І таму — такое становішча.

У асенькі набор трэба было прыняць 90 чал., а прыйшло ў тэхнікум 7. І толькі дзякуючы падрыхтоўчым курсам удалося стварыць адну групу з 23 чалавек. У папярэднім наборы на 75 месц было падана толькі 40-45 заяў.

Ёсьць значны адсеў са старэйшых курсаў. З 30 чалавек у групе засталося 15-20.

Курасоўскі тэхнікум не забясьпечан пэдагагічнымі кадрамі. Большую частку лектараў неабходна прывозіць з Менску. Па цэлым радзе прычын (адсутнасьць транспарту, нізкая аплата і інш.), гэта зрабіць не ўдаецца. А ў результаце 3-ці курс, які вярнуўся з практыкі яшчэ ў сярэдзіне кастрычніка, па сёнешні дзень ня можа распачаць заняткаў. Першыя курсы таксама займаюцца пры далёка няпоўнай нагрузцы.

Тэхнікум не забясьпечан падручнікамі і школьнай літаратурай. Невялічкая тэхнікумаўская бібліятэка ня можа задаволіць студэнтаў. Напрыклад, на анатоміі жывёліны ёсьць толькі адна кніга на ўсю групу.

Тэхнікум знаходзіцца на хутары, ня мае ніякай сельска-гаспадарчай базы. Няма электрычнага сьвятла. Памяшканьне не адпавядае свайму прызначэньню. Аўдыторыі вельмі цесныя. Прыходзіцца займацца ў дзьве зьмены і з прычыны перабояў у атрыманьні газы заняткі амаль штодзённа зрываюцца.

Тэхнікум фактычна ня мае ніякай гаспадаркі. Характэрным у гэтых адносінах зьяўляецца калодзеж. Тры гады яго амаль кожны месяц рамонтуюць, затрацілі на яго шмат сродкаў і ўсё-ж тэхнікум застаецца без вады. Улетку студэнтам прыходзіцца карыстацца вадой з капанкі, а зімою мыцца сьнегам.

З прычыны адсутнасьці вады студэнты вельмі часта засталіцца без абеду і без гарбаты.

З цэнтралізаванага снабжэньня тэхнікум зьнят. Купіць-жа харчы для сталоўкі на прыватным рынку за студэнцкія стыпэндыі ніякай магчымасьці. Якасьць грамадзкага харчаваньня студэнтаў зусім незадавальняючая.

Навучаньне ў тэхнікуме праводзіцца на яўрэйскай мове. Пасьля-ж скасаваньня амаль ні адзін чалавек не накіроўваецца на работу ў нацыянальныя калгасы. Вясной гэтага году тэхнікум выпусьціў 41 чалавека. Ні адзін з іх на працу ў яўрэйскія калгасы.

Пытаньне аб нашым тэхнікуме не адзін раз стаяла на пасяджэньнях бюро Менскага гаркому партыі і калегіі Наркамзему. Прынята шмат добрых пастаноў, але яны не праводзяцца ў жыцьцё. Менскі гарком партыі, даўшы цэлы рад вельмі важных указаньняў розным арганізацыям аб палепшэньні работы тэхнікуму, не праверыў іх выкананьня, не забясьпечыў ажыцьцяўленьня сваіх дырэктыў.

У сэктары кадраў Наркамзему, у нацкамісіі бяднаты, што-небудзь вырашыць, каб ня сказіць нацыянальнай палітыкі партыі. Таму ня прымаюць ніякіх канкрэтных мерапрыемстваў, скалчаткова развальваюць тэхнікум, зрываюць ажыцьцяўленьне нацыянальнай палітыкі.

Мы, група камуністаў яўрэйскага сельска-гаспадарчага тэхнікуме ў Курасоўшчыне, лічым такое становішча больш чым гаебным. Курасоўскі тэхнікум знаходзіцца не на месцы, працуе бяз усякай базы. У БССР ёсьць два нацыянальныя сельска-гаспадарчыя тэхнікумы з адным і тым-жа ўхілам і ў абодвых вельмі добра арганізавана вучоба і работа. Партыйныя арганізацыі тых раёнаў, дзе знаходзяцца гэтыя тэхнікумы, ня ўключыліся ў ажыцьцяўленьне пастаноў партыі і ўраду аб сярэдніх і масавай школе.

Па нашай думцы, трэба стварыць адзін аб'яднаны нацыянальны сельска-гаспадарчы тэхнікум з такой сельска-гаспадарчай базай і з такой пастаноўкай работы, якая-б забясьпечыла яму найлепшыя ўмовы для вучобы. Наркамзем БССР і Белкалгаспцэнтр павінны падыйсьці да гэтай справы не фармальна і бюракратычна, а па сур'ёзнаму вырашыць важнейшую справу, забясьпечыць праведзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі ў галіне падрыхтоўкі нацыянальных кадраў.

Група камуністаў: Цыркін, Кірпічнікаў, Лезін, Добрусан, Лібэрман.

АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» лічыць зусім ненармальным становішча ў якім апынуўся яўрэйскі с.-г. тэхнікум у Курасоўшчыне і чакае, што НКЗ БССР і Белкалгаспцэнтр прымуць самыя хуткія меры для зьнішчэньня ўсіх ненармальнасьцяй у яго рабоце.

Выканаўца кулацкіх наказаў

(Ліст групы сялян-беднякоў)

Старшыня **Яганаўскага сельсавету, Шклоўскага раёну, Архіпаў** — шкоднік і дапаможнік кулака. Ён разваліў калгас імя Варашылава. Пра гэта мы напісалі ў газэту **«Прамень камунізму»**. РайКК РСІ вынесла пастанову аб зьнятьці Архіпава з работы і аддачы яго пад суд.

Але гэту пастанову хутка забылі і Архіпаў па-ранейшаму творыць бясчынствы.

Аб тым, што Архіпаў выконвае наказ клясавага ворага, кажуць неабвержныя факты.

Архіпаў заруплуўся кампаніяй з варожага лягеру. Яго вярнейшыя памочнікі — кулакі і заможнікі: **Бачкароў Кастусь, Лаўнікаў Е., Сінчукоў Янка, Другакоў М., Кушнераў.** Гэтыя заможнікі вызвалены ад законных падаткаў і загатовак.

У кулака **Бачкарова** беднатой выкрыта ўтоеная ад абкладаньня зямля. Архіпаў за магарыч зямлю гэту ў аб'екты абкладаньня ня ўключыў. Заядлы кулак Бачкароў эксплёатаваў бедняко: Аксёнава, Кавалёва, Шаявлакова і інш., але гэта не перашкодзіла Архіпаву захаваць Бачкарова ад індывідуальнага абкладаньня.

У мястэчку Архіпавым пастаўлен кулак **Каламажын**, які скарыстоўвае своё становішча для эксплёатацыі беднаты. Форма эксплёатацыі — адработка за памол. Каламажыну такім чынам адрабляді: **Марфэль Ігнат, Яцкаў, Клінцоў.**

Тым-жа Архіпавым у памяшканьне школы пасаджан кулак, ня гледзячы на тое, што няма дзе зьмясьціцца вучням.

П'янства Архіпава з кулакамі, дэбош, хуліганства — сыстэматычнае зьявішча. Аб гэтым ведаюць раённыя арганізацыі і чамусьці трымаюць кулацкага агента на пасадзе старшыні сельсавету.

Мінькоў Н., Ткачова, Марфэль, Кацановіч, Сухі, Кацановіч Е., Байдаў, Клінцоў С., Кацаноў Л., Мінкоў Г., Кавалеўскі Р., Байдаў М., Клінцоў Л., Сальнікаў Б., Казлоў А., Карожкін З.

АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» зварачае ўвагу шклоўскай пракуратуры на неабходнасьць тэрміновага ўмяшаньня ў справы Яганаўскага сельсавету.

„Абы з рук"

(Ліст рабочых)

Ва ўсільнэху заводу імя Мясьнікова ёсьць поўная безгаспадарчасьць. Начальнік цэху тав. Карлякоў і мэнцэр Варабёў выконваюць свае абавязкі зусім дрэнна.

Улетку гэтага году цэх нашым заводзе быў пабудован уцільцэх. Будаўніцтва яго праводзілася па прынцыпу «абы з рук». У результаце, калі надышла зіма і пачаліся маразы, у цэху працаваць стала немагчыма. Тыя рабочыя, у яких няма цёплай апратки для работы, ня могуць чакат 2-3 гадзіны прабыць у цэху.

Недапушчальна пастаўлена арганізацыя і ўлік працы. Расцэнкі зьмяняюцца амаль кожны дзень, так што ні адзін работнік ня ведае, колькі ён зарабляе. Ёсьць яшчэ і ўраўніловка. Некаторыя кваліфікаваныя работнікі адпрамліваюць менш, чым чорнарабочыя.

Плянаваньне работ пастаўлена так, што на працягу дня рабочы павінен пераходзіць ад адной работы да другой. Нярэдка рабочы яшчэ з раніцы падрыхтуецца да выкананьня поўнага вытворчага заданьня, падрыхтуе сабе інструмант і г. д., а яго ўжо пераводзяць на другую работу. Вынікам гэтага зьяўляецца недавыкананьне прамфінпляну.

Далёка нездавальняюча стаіць справа са скарыстаньнем кваліфікаваных работнікаў. Часта сьлесарам даюць такую работу, як пераноска жалезнага хламу, дошак, або іншую «чорную» работу.

Пры нашым заводзе ёсьць сталоўка, работа якой не задавальняе патрэбнасьцяй рабочых. Калі-ж рабочыя зварачаюцца са скаргамі да тав. Карлякова, ён абяцае «зьвярнуць увагу і прыняць меры», але абяцае толькі на словах.

Як відаць, без умяшаньня органаў КК-РСІ нічэго абяцаньні Карлякова і да яго падобных не палепшаць умоў работы ў нашым цэху.

Група рабочых.

Па сьлядох рабселькораўскіх лістоў

„Урокі поўнасьцю ня ўлічаны"

(З пастановы прэзыдыуму Капыльскай РКК РСІ

Канстатаваць, што допіс, прысланы газэтай «Зьвязда», пад загалоўкам «Урокі поўнасьцю ня ўлічаны», у асноўным пацьвярджаецца. Равейшы старшыня калгасу «Бальшэвік», Песачанскага сельсавету. Пліт за заціск самакрытыкі атрымаў ад КК суровую вымову і зьнят з работы. У сваю чаргу былі прыняты меры партыйнага спагнаньня да бюро ячэйкі КП(б)Б за прымірэнчыя адносіны да Пліта.

Адзначыць, што дырэктыва 4-га пленуму ЦКК КП(б)Б аб рассьледваньні лістоў рабочых, калгаснікаў і заметак друку выконваецца па раёне зусім нездавальняюча. Цэлы рад апублікаваных лістоў і заметак застаецца бяз усякага разгляданьня, результаты абсьледваньня незаўсёды паведамляюцца друку, не ажыцьцяўляецца кантроль выкананьня прыняных, прынятых па рассьледваньні заметак.

Прэзыдыум КК КП(б)Б абавязвае фракцыі РВК, РКО, РСС, РПО сельскіх саветаў, а таксама парячэйкі і РК КСМ у двухтыдневны мінімі даваць адказы друку на зьмяшчаемы матар'ял у газэтах, не чакаючы таго, каб рэдакцыя прыслала напамінаньне той ці іншай установе.

За несвачасовы адказы рэдакцыі ці фармальнае прыняцьце зачытаў, замест бальшавіцкага разгаваньня, прэзыдыумам РайКК КП(б)Б будуць прымацца самыя суровыя меры партыйнага спагнаньня і аддачы пад суд, апублікоўваючы ў друку прозьвішчы канкрэтных валакітчыкаў.

Адзначыць, што з боку тав. Друтмана дапушчанага грубае ігнараваньне прысланага рэдакцыяй «Зьвязды» допісу ад 9 лістапада г. г. пад назвай «Урокі поўнасьцю ня ўлічаны» аб фактах заціску крытыкі і самакрытыкі па раёну (Мураткевіч, Рудзінскі), чым ён абвастрыўна стаў на шлях замазваньня крытыкі і самакрытыкі.

Прасіць РК КП(б)Б пытаньне аб тав. Друтману разгледзець асобна. Са свайго боку КК КП(б)Б лічыць, што тав. Друтман заслугоўвае суровай вымовы і што немэтазгодна прабываньне яго членам бюро РК і культпропам.

Аб РКС, РайАНА і пракуратуры паставіць асобна пытаньне на бліжэйшым пасяджэньні прэзыдыуму КК КП(б)Б.

У далейшым усклаьці работу па арганізацыі і кантроль за своечасовым рассьледваньнем рабселькораўскіх заметак на зал. бюро скарагаў тав. Канстанцінаву.

Старшыня РайКК-РСІ ХАЙТОВІЧ

Баскін і Дзіхцяр

Умацаваць сацыялістычную дысцыпліну працы

(Да пастановы ўраду аб прагулах)

«...Умовай павышэньня прадукцыйнасьці працы зьяўляецца, па-першае, асьветны і культурны ўздым масьнасельніцтва, па-другое, умовай аказамічнага ўздыму зьяўляецца і павышэньне дысцыпліны працоўнымі, уменьне працаваць, хуткасьці і інтэнсыўнасьці працы, лепшая ле арганізацыі». (Ленін, «Чарговыя задачы савецкай улады».).

Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, канчатковае вырашэньне пытаньня «хто каго» на карысьць сацыялізму ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы, перамогі сацыялізму на культурным фронце,—усяго гэтага дабіўся пралетарыят СССР пад кіраўніцтвам кампартыі на аснове сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны. Такім чынам важнейшая ленінская ўмова ўздыму прадукцыйнасьці працы, «а гэта ў канчатковым разрахунку самае важнае, самае галоўнае для перамогі новага грамадзкага ладу» (Ленін)— ажыцьцёўлена.

Шэсьць гістарычных умоў тав. Сталіна паказваюць канкрэтны шлях да ажыцьцяўленьня ленінскай дырэктывы аб лепшай сацыялістычнай арганізацыі працы, як неабходнай прадпасылкі да далейшага ўздыму прадукцыйнасьці працы. Партыя прымала і прымае ўсе меры да палепшэньня матар'яльна-бытавога становішча працоўных, якое вяўхільна расьце. Даволі прывесьці такія факты, як ліквідацыя беспрацоўя, разгортваньне савецкага гандлю і вырабу прадметаў шырокапажыву. Усё гэта гаворыць за тое, што ў нас ёсьць усе аб'ектыўныя ўмовы для выкананьня нашых народна-гаспадарчых плянаў. Яно (выкананьне) «залежыць цяпер выключна ад нас самых, ад нашага ўменьня і жаданьня скарыстоўваць багацейшыя магчымасьці, якія ў нас ёсьць» (Сталін).

Між тым, ва ўмовах БССР у гэтых адносінах ёсьць яшчэ рад буйнейшых недахопаў, сярод якіх у апошні час асабліва рэзка адчуваецца цякучасьць рабочай сілы. Падамо некаторыя факты.

На фабрыцы імя **Клары Цэткін** (Віцебск) пры плянавай колькасьці рабочых у 1.250 чалавек за 9 месяцаў 1932 г. прынята **418** чалавек, а звольнена **629 чал.** На папяровай фабрыцы **«Герой працы»** (Добруш) за гэты-ж час прынята 1204 рабочых і звольнена 1.315. На віцебскай абутковай фабрыцы пры агульнай колькасьці 790 рабочых, паводле пляну, за першы квартал прынята 54 рабочыя, звольнена 111, за другі квартал прынята 109, звольнен 131 і за трэці пры ўнята 190 і звольнена 202, а за 9 месяцаў прынята 353 і звольнена 444 рабочыя.

У процантных адносінах да агульнага ліку рабочых цякучасьць характарызуецца наступнымі лікамі: у сярэднім у месяц па ўсёй прамысловасьці БССР прымаецца каля 9 проц. рабочых, а звальняецца 10,9 проц., прычым на групе «А» гэтыя процанты адпаведна роўны 12,7 і 13,02, а па групе «Б»—5,8 і 8,9 проц. Па асобных галінах прамысловасьці лічыць сьведчаць аб знаячай цякучасьці рабочай сілы. На электрастанцыі прыём новых рабочых да агульнага ліку, паводле пляну, складае за 9 месяцаў 1932 г. 0,6 проц., а звальненьні—9,9 проц. Па тарфяной прамысловасьці адпаведныя лічбы складаюць: прыём — 35,6, а звальненьні — 31,6 проц., мэталяапрацоўчай — 6,6 і 8,9 проц., тэкстыльнай — 6,7 і 7,1 проц., харчовай — 7,2 і 12,6 проц. і цэлы рад іншых галін прамысловасьці маюць аналёгічны малюнак.

Гэтыя лічбы азначаюць, што ў некаторых выпадках на працягу году мяняецца раз і нават больш склад рабочых.

Амаль ва ўсіх галінах прамысловасьці выяўляецца тэндэнцыя росту цякучасьці рабочай сілы.

Гаварыць падрабязна аб вялізарнейшай шкодзе, якая наносіцца цякучасьцю рабочай сілы сацыялістычнай прамысловасьці, ня прыходзіцца. Апрача таго, што ў выніку цякучасьці мы за апошнія месяцы назіраем недахват рабочай сілы на разве прадпрыемстваў (фабрыка імя Клары Цэткін, «Пралетарская перамога», «Герой працы» і інш.), падрываецца ўсякая магчымасьць ліквідацыі абязьлічкі ў арганізацыі працы, павышэньня кваліфікацыі рабочых, стварэньня кадравага ядра вядучых прафэсій, палепшэньня матар'яльна-бытавога абслугоўваньня і строгага рэгуляваньня сыстэмы зарплаты.

Тав. Сталін даў вычарпальны аналіз новай гаспадарчай абстаноўкі і новых задач, якія ёю высоўваюцца. Гэтыя задачы ў галіне забесьпячэньня народнай гаспадаркі рабочай сілай павінны служыць асноўным крытэрыем пры выяўленьні тых прычын, па якіх гэтыя-ж задачы ня выконваюцца.

Сапраўды, матар'ялы многіх абсьледваньняў Наркампрацы БССР з поўнай відавочнасьцю паказваюць, што асноўнай прычынай цякучасьці рабочай сілы зьяўляецца невыстарчальнае ажыцьцяўленьне, а часамі і скажэньне 6 умоў тав. Сталіна. На шэйнай фабрыцы імя **Крупскай** (Менск), **«Сьцяг індустрыялізацыі»** (Віцебск), **«Камунарка»** і завод імя **Молатава** (Менск), на фабрыцы імя **Клары Цэткін** і **«Дзьвіна»** (Віцебск), ня гледзячы на вялікую цякучасьць і недахват рабочай сілы, дагаворы з калгасамі не заключаны. Больш таго, завод **«Камунар»**, напрыклад, адмовіў пэфэтычна ад калгасамі, аказвае ім культурную і тэхнічную дапамогу, а рабочая сіла з калгасаў паступае на завод усё-ж такі самацёкам.

Буйнейшыя недахопы і скажэньні выяўлены і ў адносінах правядзеньня зарплаты. На гледзячы на значныя посьпехі ў справе ўкараненьня зьдзельшчыны ў вашу прамысловасьць (на фабрыцы **«Герой працы»** зьдзельшчынай ахоплена 78,7 проц. рабочых з агульнага ліку іх, на гуце імя **Домбаля**—87 проц., на запалкавай фабрыцы **«Пралетарская перамога»**—72 проц., на панчошна-трыкатажнай імя **Клары Цэткін** — 84 проц., і інш.), яна яшчэ праводзіцца невыстарчальна. Яшчэ ёсьць шмат прадпрыемстваў з нізкавым ахопам зьдзельшчынай. На заводзе **«Чырвоны хімік»** усяго ахоплена 50 проц. рабочых, сьпіртавым— 52 проц., імя **Сталіна** (Магілеў)—53 проц. і г. д.

Прадпрыемствы ва многіх выпадках праводзяць зьдзельшчыну фармальна і па сваёй якасьці яна не адпавядае фактычнай зарплаце рабочых. Напрыклад, на **добрускай** фабрыцы тарыфная стаўка зьдзельшчыка-сьлесара 3-га разраду складае ў гадзіну 47,5 кап., а фактычна яго заработак у верасьні месяцы даслягаў 1 руб. 74 кап. у гадзіну, гэта значыць—прырост на 273 проц., сьлесар 7-га разраду—39,7 кап., а фактычна 1 р. 27 кап. (прыработак 290 проц.). На інструмантальна-мэблевай фабрыцы тарыфная стаўка мэбэльшчыка 6-га разраду—4 руб. 68 кап. у гадзіну, а фактычна—7 руб. 93 кап., па ўцільцэху —4 р. 10 кап. і 7 руб. 71 кап.

Усе гэтыя факты недапушчальнага высокага разрыву паміж тарыфнай стаўкай і фабрычным заработкам сьведчаць аб зусім дрэннай пастаноўцы тэхнічнага нармаваньня, якое яшчэ не ператварылася ў важнейшы рэгулятар зарплаты. У выніку гэтага яшчэ не ліквідавана ўраўніловка. На фабрыцы імя **Клары Цэткін** работніца-матальшчыца **па 6-га** разраду атрымлівае **3 руб. 57 кап.** у дзень, а вязальшчыца 9-га разраду — **3 руб. 45 кап.**, сартыроўшчыца **5-га разраду—2 руб. 89 кап., а абрэзчыца 4-га разраду—3 руб. 4 кап.** На фабрыцы **«Чырвоная Бярэзіна»** зацкатчык чурак ад пілы 2-га разраду атрымлівае **4 руб. 14 кап.** у дзень, а зарадчык 4-га разраду (вядучая прафэсія)—**4 руб. 69 кап.** Буйныя непалады ёсьць і ў галіне матар'яльна-бытавога абслугоўваньня, стварэньня харчовых баз і аздараўленьня працы.

Гэтыя факты паказваюць, якія адказьнейшыя задачы пастаўлены партыяй перад гаспадарчымі і прафсаюзнымі арганізацыямі і органамі працы ў справе барацьбы з цякучасьцю рабочай сілы, за сацыялістычную арганізацыю працы.

Пастаўленыя партыяй задачы патрабуюць самай жорсткай бальшавіцкай дысцыпліны ваванасьці, перш за ўсё, з боку саміх гаспадарнікаў і кіраўнікоў сацыялістычнай гаспадаркі.

Пралетарская ўлада стварыла самае перадавое ў сьвеце працоўнае законадаўства, якое дае ўсе гарантыі працоўным масам па забесьпячэньні іх матар'яльных і культурна-бытавых патраб.

Мы ня можам дапусьціць, каб палепшэньне матар'яльнага і культурна-бытавога абслугоўваньня працоўных, выкананьне ўсіх народна-гаспадарчых плянаў падрывалася парушальнікамі працоўнай дысцыпліны ў сацыялістычнай вытворчасьці.

Партыя завастрае ўвагу на ўмацаваньні працоўнай дысцыпліны, што мае асабліва значэньне імецца зараз ва ўмовах новай абстаноўкі, калі адной з галоўных крыніц узкарыцьця патраб народнай гаспадаркі рабочай сілай зьяўляецца вёска.

У сацыялістычную прамысловасьць уліваюцца мільёны новых людзей, якія не прайшлі пралетарскай школы. Яны прыносяць з сабой на сацыялістычную вытворчасьць рэшткі дробна-буржуазнай псыхалёгіі, уплыў клясава-варожых настроеў. У пасасобных-жа выпадках мы маем яўна сьвядомыя клясава-варожыя шкоднікі імкнець ні сарваць шлях сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя настроі ў тым, каб «ад савецкай улады больш атрымаць і менш ёй даць» (Ленін).

Адсюль выпікаюць прагулы, лятунства, цякучасьць, рвацтва. На фабрыцы **«Пралетарская перамога»** прагулы з 0,81 проц. за першы квартал павялічыліся да **2,4 проц.** у III квартале.

Гаспадаркі, прафсаюзы і органы працы часта дапускаюць простае лібэральнічаньне ў гэтай важнейшай справе барацьбы за ўмацаваньне працоўнай дысцыпліны. Не выкарыстоўваюцца пры гэтым усе сродкі, даныя савецкімі законамі. У выніку—прагульшчыкі і лятуны атрымліваюць магчымасьць па многа раз пераходзіць з аднаго месца работы на другую, атрымліваючы ўсе матар'яльныя выгады і яўна зрываюць выкананьне прамфінпляну.

ПРАТЭСТ Б. ПАСЛОЎ ПОЛЬСКАГА СОЙМУ, КІРАЎНІКОЎ „ГРАМАДЫ“ І „ЗМАГАНЬНЯ“

супроць расправы над тав. Тарашкевічам

«На землях **Заходняй Беларусі** тэрор акупантаў ня ведае ніякіх межаў. Ён характарызуецца зьнішчэньнем усіх праяўленьняў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, заганяньнем яго ў падпольле.

Пасьля разгрому «Грамады» і «Змаганьня» руйнуецца масавая культурна-асьветная арганізацыя «ТБШ». Ліквідуецца беларускае школьніцтва, прэса, выдавецтвы. Арышты і рэпрэсіі супроць нацыянальна-вызваленчых работнікаў узмацняюцца. На 28 лістапада вызначан суд над прамадыром Беларускай Работніцка-сялянскай Грамады т. **Тарашкевічам**, якога ў правакацыйны спосаб фашысты схапілі й мучаць у ізаляцыі. Хочуць зноў трымаць яго ў лёхах турмы доўгія гады.

Паны Луцкевічы, Астроўскія, Ярэмічы, Станкевічы — верныя абаронцы інтарэсаў беларускай буржуазіі і кулакоў, — разам з ППС і «Стронніцтвам Людовым» дапамагаюць усімі сіламі фашысцкай рэакцыі ў яе барацьбе з рэвалюцыйным нацыянальна-вызваленчым рухам працоўных мас.

Мы, былыя дэпутаты ў польскі сойм ад беларускіх сялянска-работніцкіх арганізацый «Грамады» і «Змаганьня» супроць зьверскіх гвалтаў узьнімаем свой голас рашучага пратэсту.

Пасьля ліквідацыі масавых легальных арганізацый, якія мы рэпрэзэнтавалі, пасьля гадоў катаргі, праведзеных намі ў фашысцкіх турмах, мы апынуліся ў сталіцы Беларускай Савецкай дзяржавы — у Менску.

Мы знаходзімся цяпер у СССР — адзіным краі ў сьвеце, дзе ўладу трымаюць у сваіх руках рабочыя і сяляне, якія ня ведаюць крызісу і беспрацоўя, якія пераможна будуюць новы сацыялістычны лад. Творчымі намаганьнямі і энтузіязмам мас закончана пяцігодка за чатыры гады і падведзен фундамант сацыялістычнай эканомікі. Другая пяцігодка на гэтай базе ставіць задачу поўнай ліквідацыі клясаў і пабудову бясклясавага грамадзтва.

СССР — братэрскі саюз аб'яднаных у ёй народаў, бацькаўшчына працоўных усяго сьвету, — пастаўленую перад сабой задачу ў другой пяцігодцы выканае і літуценьні мільёнаў працоўных — мэта іх барацьбы — бясклясавае грамадзтва стане фактам.

У гэты самы час, у другім сьвеце, сьвеце капіталізму шалее пачуваны ў гісторыі эканамічны крызіс, беспрацоўе і голад мільённых мас.

Асабліва цяжкае становішча на **Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне.**

Найважнейшыя галіны прамысловасьці на Заходняй Беларусі заміраюць. Сялянства душыцца ад безьзямельля і аграрнага крызісу. Голад ахапіў у свае абцугі мільёны насельніцтва. Увесь цяжар гаспадарчай катастрофы, выдаткі на падрыхтоўку вайны супроць Савецкага саюзу ўзвальваюцца на працоўныя масы. Растуць падаткі і павінасьці: дзяржаўныя, самаўрадавыя, дарожныя, страхавыя, царкоўныя. Масавая ліцытацыя апошняй сялянскай маемасьці стала штодзённым зьявішчам. Камасацыя і ліквідацыя сэрнітутаў адбірае зямлю ад малазямельных і перадае кулаку. Новыя абшары зямлі займаюцца ваеннымі асаднікамі. Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна — поле ваеннага нападу на Савецкі саюз — наводнены войскамі і гнуцца пад цяжарам яго пастою.

Супроць калёніяльнай эксплёатацыі, дзікага нацыянальнага ўціску паўстаюць да барацьбы штораз шырэйшыя масы.

Ня гледзячы на тэрор, ломячы гэты тэрор, хваля забастовак пракацілася ў 1932 годзе па ўсіх галоўных вучастках прамысловасьці. У **Паб'яніцах, Петракове, Дамброўскім басэйне** яна вылілася ў барацьбу за фабрыкі. Шырыцца арганізаваны адпор сялянскіх мас усёй Польшчы супроць наступленьня фашызму, супроць нацыянальнага ўціску, за самавызначэньне аж — да аддзяленьня ад Польскай дзяржавы.

У **Камень-Кашырску, Асташыне, Ядзве** ён падымаецца да ўзброенай барацьбы з войскам і паліцыяй. У **Ліскім павеце** ён перарос у мясцовую сялянскую вайну. На **Валыні** і **Палесьсі** разгараецца партызанская вайна. З ваяцца — канец усёй Польшчы нясецца кліч у гушчах прыгнечаных і падняволеных — **рукі прэч ад Савецкага саюзу!**

Трашчаць асновы фашысцкай дыктатуры.

Прымаючы ўдзел у пабудове сацыялізму ў СССР, што зьяўляецца справай працоўных усяго сьвету, мы ня можам забыць аб непасрэднай гераічнай супольнай барацьбе рабочых і сялян Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны і Польшчы. **Мы заклікаем усіх,** каму дорага справа вызваленьня прыгнечаных народаў, справа зьнішчэньня ўсякай эксплёатацыі чалавека чалавекам, **далучыцца да нашага голасу пратэсту супроць белага тэрору ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, дамагацца вызваленьня палітзьняволеных у Польшчы, вызваленьня т. Тарашкевіча.**

Пётра Мятла, Сымон Рак-Міхайлоўскі, Паўла Валожын, Язэп Гаўрылік, Ігнат Дварчанін, Флегонт Валынец. Я. Грэцкі».

ЯКУБ КОЛАС

Далоў панскую інквізыцыю!

Наўрад ці ведае гісторыя народаў прыклады такой пакуты, такога цяжкага лёсу, які выпаў на долю працоўных мас Заходняй Беларусі. Расстрэляная гарматамі імпэрыялістычнай вайны, зрэзаная акопамі, апанітая калючымі дротамі, вытаптаная нагамі чужаземных армій, спаленая пажарамі, абязьлюдненая бежанствам, яна цяпер узьведзена на эшафот катамі фашысцкай рэакцыі для расьпяцьця на крыжы нацыянальнай і клясавай расправы.

Загашаны вогнішчы беларускай культуры, ідзе жорсткая ваенная калёнізацыя зямель беларускага сялянства праз засяленьне асаднікаў, расчышчаецца пляцдарм для інтэрвэнцыяністкіх замахаў супроць вольнага Саюзу Савецкіх Рэспублік. Лютуюць карныя экспэдыцыі, шырока практыкуюцца ваенна-палявыя суды, расстрэлы, шыбеніцы, пакідаючы далёка за сабою эпохі мураўёўскіх шыбеніц і сталышынскіх гальштукаў. Ідзе фізычнае вынішчэньне ўсіх, хто падае голас пратэсту супроць гвалту і нячуванага зьдзеку азьвярэлых акупантаў. Тысячы, дзесяткі тысяч лепшых сыноў прыгнечанага народу доўгімі гадамі томяцца ў пяжкай няволі панскіх астрогаў, адкуль ім адна дарога — суд панскай інквізыцыі з яе катаржнымі і сьмяротнымі прысудамі. І гэта інквізыцыя судзіць цяпер лепшага з лепшых прадстаўнікоў працоўных мас Заходняй Беларусі — Браніслава Тарашкевіча. За што катуе, за што судзіць яго панская інквізыцыя? За тое, што Тарашкевіч ня здрадзіў свайму народу, за тое, што не пашоў, як Луцкевічы, Астроўскія, Акінчыцы і інш., на згоду з польскім фашызмам, за тое, што голас яго пратэсту супроць акупантаў зьвініць голасна і цьвёрда, як суровы і справядлівы прысуд гісторыі.

Далоў панскую інквізыцыю і яе словаблудзтва!

Прач крывавыя рукі ад Браніслава Тарашкевіча!

Няхай высока ўзаўецца чырвоны сьцяг перамогі на гонях Заходняй Беларусі!

Я. КУПАЛА

Браніславу Тарашкевічу

Суд ідзе...

«О сьмерць, вам, панове, ксёнжэнта,
магнаці,
За нашеи неволеи, кайданы!..»
Ня доўга, паны, ужо вам панаваці
Над краем праз вас катаваным.

Гібелі калісь вашы ў турмах пад царам
Паўстанцы, Славацкі, Міцкевіч —
Сягоньня пад Польшчай нявінная ахвярай
Гібее ў турме Тарашкевіч.

Ня вам, царадворцам, чынічці расправу
Над тым, хто змагаўся за долю,
Засудзіць самих вас народ неўзабаве,
Каб вашай ня ведаць няволі.

Вам страшна было за сваё панаваньне
Грамады рабоча-сялянскай,
І мсьціце, і мсьціце ўсім да скаваньня,
Хто ласкі ня хоча знаць панскай.

Хаўтурныя ваны званы зьмумнтовы,
Пакінуць граць вёсельным песьні,
Устае з-пад ярма чалавек ужо новы,
Ідзе грозных бураў прадвесьне.

І вашыя катаргі, вёсельні, турмы
Самих-жа вас песьціці будуць;
Ужо граюць прызыўныя гулкія сурмы
На бітву супраць вас, прыблудаў.

Ідзе, набліжаецца помста народу
І вас і суды вашы пішчыць,
Ідуць з сутарэньняў, з хат курных, з
заводаў,
Каб волю здабыць, узьвялічыць.

Так вам, дармаедам, распасьвеным сыта
Працоўных крывёю і працай,
Магіла-грабніца навосьцеж адкрыта,
І вам ад яе не схавацца.

***

Гібелі калісь вашы ў турмах пад царам
Паўстанцы, Славіцкі, Міцкевіч,
Сягоньня пад Польшчай нявінай ахвярай
Гібее ў турме Тарашкевіч.

Нясеце-ж, панове, нявольніцтва далей,
Вітае вас цень Мураўёва...
Калісьці ў Галіцыі вас пілавалі,
Цяпер палілуюць панова.

Судзеце суды Мураўёўскім законам
Над людам заганным у краты,
А выдасьць прысуд свой судзьдзя ў чырвоным.
На вас, на саміх, царанты.

Паходня з Усходу асьвеціць дароті,
Шляхі за слупамі з арламі,
Даможыцца праўда сваёй нерамогі
Над белым арлом і над вамі.

Пра вас не забудзе, паны, БССР,
І посьці пакіне краіне,
Як жучыце нашых братоў вы цяпер,
Як вина ўладарства загіне.

***

Зашумяць, загудзіць
Завіруха,
Толькі думай, толькі ведай,
Толькі слухай.

Мы будуем, мы пускаем
Фабрыкі, заводы,
Поле трактар засявае,
Садзім агароды.

Да нас госьці ў госьці едуць
З усёй кулі зямкай,
І ўсе бачаць, што жывецца
Нам зусім ня кепска.

Мы будуем, з будаўніцтва
Робім сабе сьвята...
А там толькі, у Польшчы толькі
Усё купляюць катаў.

А здаецца-ж кат па кату
Ясьне-паны селі
І катуюць ад надзелі
Да новай надзелі.

Над аграбленай краінай
Зьвісла ночай хмара,
А паны ўсё разважаюць
Аб дыме пажараў.

Пойдуць, пойдуць по задоўга
Вашыя палацы,
Ды з такім пажарам-дымам,
Толькі дзівавацца!

Ні жандары, ні салдаты
Вашыя ня ўстоять,
Як працоўныя грамады
Зрухнуцца да бою.

Банкатуй сабе Варшава
Банкатуй крывава,
Хай ліецца акавіта
З крывёй на славу!

Бэльведэр дачэсны доўга
Панаваць ня будзе,
У пацелішча абернуць
Паўстаўшыя людзі.

Зашумяць, загудзіць
Завіруха,
Толькі думай, толькі ведай,
Толькі слухай.

***

«О сьмерць вам, панове, ксёнжэнта,
магнаці,
За нашеи неволеи, кайданы!..»
Ня доўга, паны, ужо вам панаваці,
Над краем праз вас катаваным.

Гібелі калісь вашы ў турмах пад царам
Паўстанцы, Славацкі, Міцкевіч —
Сягоньня пад Польшчай нявінкай ахвярай
Гібее ў турме Тарашкевіч.

Менск, 22-XI — 32 г.

З фашыстоўскай падваротні

У засьценку трушчаць косьці,
Пан Луцкевіч чэша ў госьці,
Там за працай кат, кат,
Пан Луцкевіч рад.

Ён прадаў сягодня брата,
Не благая будзе плата,
Пан Луцкевіч — нюх, нюх —
Чуе смачны дух.

Ён на кухню ваяводы
Дасканала знае ходы:
Пан Луцкевіч — гаў, гаў,
Каб Кіртыклію даў.

Ваяводу ён дагодзіць:
Так па задніх лапках ходзіць,
Так лісьліва — віль, віль.
«Пан Луцкевіч, піль!»

Пан Кіртыкліс кінуў злоты,
Пан Луцкевіч ліжа боты:
Так старанна — лізь, лізь,
Каб аж боты — бліс!

«Пёс рахманы ды ласкавы,
Даць яму вянгліны й кавы.
Пан Луцкевіч, еж, еж,
Будзеш гаўкаць лепш.

Начапі на шыю сьмела
Банцік бел-чырвона-белы:
Як адслужыш — трах, трах —
Не вялікі страх.

Вось яшчэ кіліпак «вуцкі»,
А цяпер — пашоў да буцкі!
Пан Луцкевіч ляж, ляж
— Я, паночак, ваш.

Шчэрыць зубы на ўсход сонца,
І гайсае па старонцы
Яго верны брэх, брэх —
Здрадзіць пану грэх.

Ён ня можа спаць ні есьці,
Бо ідуць страшныя весьці,
Камунізм ідзе, ідзе
Дзе-ж даваецца, дзе?!

А за ім яшчэ паўсотні
З фашыстоўскай падваротні
На працоўных — гыр, гыр! —
«За грамадзкі мір».

Ланцугі аднак-жа рвуцца,
Будзе пану, будзе й сучцы:
Будуць суку біць, біць,
Будзе з панам выць.

ХРОНІКА

* **Акадэмік Воблы** прыязджае ў бліжэйшыя дні з Украіны ў Менск для іграчытаньня ў Беларускай Акадэміі Навук дакладу аб праблеме «вялікага Дняпра».

* **Тав. Брыгневіч** прызначан намесьнікам старшыні Дзяржпляну БССР.

* **Кіно-фабрыка Белдзяржкіно** скончыла дзьве гукавыя дзіцячыя фільмы. «Пячатка часу», прысьвечаную абароне краіне і «Баём насупраць»—аб барацьбе за ўсеагульнае навучаньне ў вёсцы.

* **Новы мэханічна-зборачны цэх** будзе окончан будаўніцтвам да 1 студзеня 1933 г. на заводзе «Камунар» у Менску. Цэх мае плошчу ў 6.000 кв. мэтраў і будзе абсталяваны навейшымі варштатамі. Кошт будаўніцтва—1 мін. руб.

* **Брыгада работнікаў Наркамлесу** на чале з членам калегіі т. Громавым прыязджае з Масквы ў БССР для дапамогі мясцовым арганізацыям у ліквідацыі прарыву на выканьні праграмы лесазагатовак чацьвертага кварталу.

* **Два начныя санаторыі** адкрыты ў Бабруйску «Чырвоным Крымам» для калектыву Чырвонай армії.

* **На 100 проц.** і раней тэрміну выканаў пляны здачы дзяржаве збожжа, бульбы, мяса і малака яўрэйскі калгас «Новае жыцьцё», Крупскага раёну.

* **Усебеларускія двухтыднёвыя курсы** па трусагадоўлі праведзены Беларускім саюзам у Віцебску. Курсы окончылі 17 чал.

Рэканструкцыя беларускага вакзалу ў Маскве

ВЯСНОЙ 1933 Г. У МАСКВЕ ПАЧНУЦЦА РАБОТЫ ПА КАРЭННАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ БЕЛАРУСКАГА ВАКЗАЛУ МБВ ЧЫГ. ІСНУЮЧЫ БУДЫНАК, ЧАСТКОВА НАДБУДОЎВАЦЦА. ДА СЯРЭДНЯЙ ЧАСТКІ ВАКЗАЛУ ПРЫБУДОЎВАЕЦЦА ПАМЯШКАНЬНЕ, ЯКОЕ ПАВЯЛІЧЫЦЬ ПЛОШЧУ ВЭСТЫБЮЛЮ І ЗЬМЕСЬЦІЦЬ БІЛЕТНЫЯ КАСЫ І ЗАЛІ ДЛЯ БАГАЖНЫХ АПЭРАЦЫЙ.

ДАБУДОВА Ў ЛЕВАГА КРЫЛА ЗЛУЧЫЦЬ БУДЫНАК ВАКЗАЛУ З КАМЭРАЙ ХАВАНЬНЯ РУЧНОГА БАГАЖУ. ЛЯ ПРАВАГА КРЫЛА ВАКЗАЛУ **БУДЗЕ ПАБУДАВАНЫ ШАСНАЦЦАЦІПАВЯРХОВЫ БУДЫНАК—АТЭЛЬ ДЛЯ ЧУЖАЗЕМЦАЎ, ЯКІ, ЯК І ВАКЗАЛ, БУДЗЕ МЕЦЬ НЕПАСРЭДНУЮ СУВЯЗЬ З МЭТРАПАЛІТЭНАМ.**

У СУВЯЗІ З РЭКАНСТРУКЦЫЯЙ ВАКЗАЛУ З БУДЫНКУ ЯГО ВЫСЯЛЯЮЦЦА РОЗНЫЯ СЛУЖБЫ, НЯ ЗЬВЯЗАНЫЯ З АБСЛУГОЎВАНЬНЕМ ВАКЗАЛУ І ПАСАЖЫРАЎ. ЦЯПЕР ТАЯЯ СЛУЖБЫ ЗАЙМАЮЦЬ БОЛЬШ ПАЛОВЫ БУДЫНКУ. ДЛЯ ГЭТЫХ СЛУЖБ І ДЛЯ ДЫРЭКЦЫІ МБВ ЧЫГ. БУДЗЕ ПАБУДАВАНЫ СЯМІПАВЯРХОВЫ БУДЫНАК.

АГУЛЬНЫ КОШТ УСІХ РАБОТ, ЗЬВЯЗАНЫХ З РЭКАНСТРУКЦЫЯЙ БЕЛАРУСКАГА ВАКЗАЛУ Ў МАСКВЕ,—9,5 МЛН. РУБ. РАБОТЫ МЯРКУЕЦЦА СКОНЧЫЦЬ У КАНЦЫ 1934 Г.

Паведамленьні

— 60 літаваца, у 7 гадз. вечара, у памяшканьні фізычнага корпусу Унівэрсытэцкага Гарадка пачынаюцца заняткі ў Менскі антырэлігійным рабочым унівэрсытэце. Тыя, што запісаліся ва унівэрсытэт павінны зьявіцца без спазьненьня.

— 30-XI-г. г. у клюбе Карла Маркса, у 6 гадз. вечара адбудзецца зьлёт кандыдатаў партыі Сталінскага прызыву. Мандаты на зьлёт выдаюцца ў парткоме КП(б)Б, пакой № 27, 2-гі паверх, з 9 гадз. раніцы, да 5 гадз. вечара.

—Менгарком КП(б)Б склікае нараду сакратароў ячэек СВБ 29-XI-32 г., у 6 гадз. вечара, у памяшканьні ГК КП(б)Б, пакой № 32. Сакратары ячэек павінны зьявіцца з матаўяламі аб рабоце ячэек «Вяпбожніц».

— Мен. ГК КП(б)Б паведамляе ўсесь партыйны актыў г. Менску, што заняткі на дакадных курсах партактыву пачынаюцца з 1 сьнежня 1932 г. па наступнай чарзе: культпропы калектываў і ячэек 1,11 і 21, старшыні фабзавуматкомаў 3,13 і 23, сакратары п-к. і ячэек 5,15 і 25, дырэктары прадпрыемстваў, устаноў 8,16, 26 кожнага месяца. Заняткі адбудуцца ў 9 гадз. раніцы ў Доме Комасмольцы Першая тэма: «Імпэрыялізм—кацун пралетарскай рэвалюцыі».

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

10 год лясной навукова-дасьледчай справы ў БССР

Сёлета мінае 10 год з моманту арганізацыі ў БССР лясной навукова-дасьледчай работы. Яшчэ ў маі 1922 г. на лясной нарадзе пры НКЗ была створана пастаянная камісія, якая выбрала Жаркаўскую лясную дачу, як аб'ект для вывучэньня лясоў у БССР і гаспадаркі ў іх. 11 лістапада 1922 г. былі зацьверджаны схэма арганізацыі навукова-дасьледчых устаноў і праграма работ.

Замест былой цэнтральнай дасьледчай станцыі ў Горках, за апошнія гады створан самастойны комплексны дасьледчы інстытут у Гомелі й складзе сэктароў сыцёвага, эксплёатацыйнага, эканамічнага, мэханічнага і хімічнага. Навукова-дасьледчы інстытут мае свае лябараторыі і габінэты, а таксама і дасьледчыя вучасткі ў Бабруйскім, Барысаўскім і Аршанскім раёнах. Пры царызме-ж у Беларусі ня было ні аднэй навукова-дасьледчай установы.

БНДІІ падрыхтаваў да друку рад работ, якія будуць выходзіць паасобнымі зборнікамі. Адзін з такіх зборнікаў «Падсочка ў Беларусі» ўжо выйшаў з друку. У аднаку 15-й гадавіны Кастрычніка супрацоўнікі інстытуту склалі кніжку «Лясная гаспадарка БССР», якая дае падрабязную гісторыю навукова-дасьледчай работы ў галіне лясной гаспадаркі.

Лясная дасьледчая справа—маладая галіна работы—мае ўсе пэрспэктывы для разьвіцьця. Трэба пажадаць, каб партыйныя, прафесыянальныя і гаспадарчыя арганізацыі яшчэ больш дапамаглі ў далейшым разьвіцьці па шляху стварэньня садыялістычнай лясной гаспадаркі і лясной прамысловасьці.

Праф. В. І. Пераход.

Новы парадак падрыхтоўкі кадраў асьпірантуры

Прэзыдыум Беларускай Акадэміі Навук выпрацаваў ряд практычных мерапрыемстваў па рэалізацыі дырэктыў ЦВК СССР, ЦК КП(б)Б і СНК БССР па пытаньні аб падрыхтоўцы кадраў асьпірантаў.

Тэрмін вучобы асьпірантаў навукова-дасьледчых інстытутаў установлены ад 2-х да 3-х год. У прыватнасьці, па інстытутах літаратуры, мовазнаўства, права, гісторыі і філёсофіі тэрмін вызначан у 2 з паловай гады. Для матэматыкаў, фізыкаў, геолёгаў, хімікаў, біолёгаў і эканамістаў—3 гады. Тэрмін вучобы асьпірантаў падрыхтоўчага аддзяленьня—3 гады.

Да 1 студзеня для кожнага асьпіранта будзе ўстаноўлен профіль і індывідуальны вучэбна-навуковы плян работы. Уводзіцца абавязковая здача залікаў па ўсіх прадметах, а перад скончэньнем інстытуту абарона навуковай дысэртацыі.

Кожны асьпірант абавязан прадставіць на працяку вучобнага году два пісьмовыя даклады, арабіць ня менш 4-х выступленьняў і вывучыць на працягу ўсяго тэрміну вучобы дзве замежныя мовы.

Пэдагагічная работа, як практыка, уводзіцца в другога курсу ў колькасьці ня вышэй 120 гадавых гадзін. Першаму курсу пэдагагічная практыка забаронена.

Асьпірантам катэгарычнага забаронена сумяшчаць вучобу з якой-бы там ні было адміністрацыйнай работай. Інстытуту асьпірантуры прапанавана праверыць акадэмічную пасьпяховасьць асьпірантаў, даўшы прэзыдыуму весткі аб тых, якія не здалі ў тэрмін работ з мэтай выключэньня такіх асьпірантаў са складу інстытуту. Праверка павінна быць скончана да 15 сьнежня. У далейшым, як правіла, устанаўлівацца праверка акадэмічнай пасьпяховасьці ўсіх асьпірантаў два разы ў год.

Прыём на падрыхтоўчае аддзяленьне ў 1933 г. спыняецца. Устанаўляецца дыферэнцыраваны разьмер стыпендыі ад 175 да 300 руб. у месяц. Адначасова з палялічэньнем стыпендыі выдзяляецца прэміяльны фонд да 10.000 руб.

Для забясьпячэньня яшчэ лепшай асьпірантаў у 1933 г. намечана пабудова інтэрнату на 260 асоб.

СЁЬНЯ, у 7 гадзін вечара, у галоўным корпусе Унівэрсытэцкага Гарадку (3-ці паверх) адбудзецца

ШЫРОКІ ДЫСПУТ

аб 5-й Усебеларускай мастацкай выстаўцы,

наладжаны інстытутам літаратуры і мастацтва Беларускай Акадэміі Навук сумесна з выставачным камітэтам 5-й Усебеларускай мастацкай выстаўкі.

Запрашаюцца рабочыя, пісьменьнікі, мастакі і ўсе жадаючыя.

УВАХОД ВОЛЬНЫ.

29-га лістапада ў 7 гадзін вечара, у памяшканьні гарсавету (вялікая зала) адбудзецца

ЗЬЛЁТ ДЭПУТАТАЎ І СЭКЦЫЯНЭРАЎ МЕНГАРСАВЕТУ

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Аб 2-месячніку паходу сэкцый дэпутацкіх груп у галіне выробу тавараў шырокага спажываньня (дакладчык тав. Карнеёўскі).

2. Інфармацыя з месц ад фабрык, заводаў—дэпутацкія групы і члены савету; ад усіх арцелей кіраўнікі арцелей аб выкананьні плянаў выробу тавараў шырокага спажываньня.

Яўка усіх дэпутатаў, сэкцыянэраў гарсавету і старшыні арцелей абавязкова.

Аргмасавы аддзел Менгарсавету.

Памяшканьне Польскага дзярж. тэатру Сьвецкая, 28 тэл. 15-20

БЕЛАРУСКІ РАБОЧЫ ТЭАТР ЦСПСБ. Н. Федзін.

СЁЬНЯ

ЧЫНГІЛЬБУД П'еса ў 3-х актах

Пастаноўка В. Я. Галаўчынера.

Музыка С. Палонскага. Танцы Е. І. Вудьф

Пачатак роўна ў 8 г. 30 м. Білеты ў касе тэатру з 12-2 і з 4-9 і ў рабочай касе з 12-2 і ад 4-6 гадз.

Па калектыўных заяўках—скідка.

Першы Дзярмоўны Тэатр (БДТ—1)

Сёньня Кузьма Чорны

БАЦЬКАЎШЧЫНА

Эпопея ў 4-х дзеях.

Пачатак у 8 гадзін вечара. Білеты ў раб. касе і касе тэатру.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА КАСА—ад 1 гадз. Занежны мастацкі фільм ШТУРМАН З „ПРЫБОЯ“ Драма ў 8 частках

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ Каса—ад 1 г. дня. 1) Мастацкі фільм Чалавек застаўся адзін 2) Кіно-хроніка Саюзкіно

Пралетары Амэрыканская камедыя ПАСЬЛЕШНАЕ ВЯСЕЛЬЛЕ Зьмыш праграмы—хроніка Дзённая дзіцячая сэанс ЗА ЧАЦЬВЕРТУЮ ЗЬМЕНУ

СПАРТАК КАСА—ад 1 г. дня Новы мастацкі фільм ЁСЬЦЬ КАПІТАНІ драма ў 7 частках

Сёньня, 28 лістапада, у 7 гадз. вечара, у залі Дому Камасоўцы (рог Энгельса і Карла Маркса)

— адбудзецца —

пасяджэньне акадэмічнага савету акадэміі навук БССР

разам з партыйнымі грамадзянамі і прафэсіянальнымі арганізацыямі прысьвечанае 300-годзьдзю аб дня нараджэньня буйнейшага матэрыяліста Б. Спінозы.

Парадак дня: Спінозы—як буйнейшы матэрыяліст і атэіст 17 стагодзьдзя; даклад вуч. спэцыяліста тав. Крыяніцкага.

Уваход па білетах, якія можна атрымаць па заяўках устаноў і арганізацый у канцылярыі АН БССР (рог Ленінскай і Унівэрсытэцкай, 2 9-35) з 10 да 15 гадз. Для супрацоўнікаў і асьпірантаў АН уваход па пасьведчаньнях.

Сёньня, 28-га лістапада, у 7 гадзін вечара ў Доме Пісьменьніка (Сьвецкая, 68) адбудзецца

АГУЛЬНЫ СХОД ПІСЬМЕНЬНІКАЎ.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Вынікі першага пленуму Усесаюзнага Аргкамітэту і задачы беларускай савецкай літаратуры.

Уваход вольны. АРГКАМІТЭТ.

У аддзел аб'яў званеце па тэлефону 7-81

10-ты ДЗЯРЖЗЬВЯРЫНЕЦ ПРЫБЫЎ НОВЫ ТРАНСПАРТ

мышэй і птушак.

Зьвярынец адкрыт з 9 гадз. раніцы да 11 гадз. вечара штодзённа.

Па калектыўных заяўках прадстаўляецца 50 проц. скідкі. Заварачцца ў кантору зьвярынцу загадзя.

Да ўвагі слухачоў курсаў мэдсясьцёр „Чырвонага Крыжу“

Менгаркамітэт „Чырвонага Крыжу“ паведамляе, што 1-га сьнежня, у 7 гадз. вечара, ў памяшканьні „Чырвонага Крыжу“ (Першамайская, 7) адбудзецца

АРГАНІЗАЦЫЙНЫ СХОД

усіх прынятых на курсы мэдсясьцёр.

Яўка ўсіх прынятых абавязкова.

Менскі хаміка-тэхналёгічны тэхнікум АБВЯШЧАЕ

з 20 лістапада па 15 сьнежня 1932 г.

НАБОР СТУДЭНТАЎ

з адрываў ад вытворчасьці на аддзяленьні па хімічнай:

1. Механічнае—30 чал. (профіль—тэхнік-мэханік).

2) Тэхналёгічнае—30 чал. (профіль—тэхнік-тэхналёг).

Умовы прыёму, згодна апошняй пастановы ўраду.

Даведкі і анкеты ў канцылярыі тэхнікуму (Менск, Падгорны завулак № 7, хаміка-тэхналёгічны тэхнікум) ад 10 да 15 гадзін штодзённа.

Для заявы і дакумэнтаў абавязкова прыслаць паштовых марак на 40 кап.

Пачатак заняткаў 1 студзеня 1933 г.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Згодна загаду па Белдарбуду ад 20-11-32 г. № 252,

10 дарбудвучастак (м. Асіповічы)

ліквідуецца.

Усе прэтэнзіі прымаюцца ліквідаванне да 10 сьнежня 1932 г.

Ліквідкамісія.

ГОРАЦКІ ДЗЕННЫ РАБФАК ІМЯ ГАЛАДЗЕДА

пры інстытуце нармовых культур і агрэхміі

абвяшчае НАБОР СТУДЭНТАЎ

на ТРЭЦІ курс з'бфаку.

Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй на 100 проц. Да заяў далучаць даку менты пералічаныя ў правілах прыёму для паступаючых на рабфак.

Іспыты для паступаючых адбудуцца з 15-га сьнежня 1932 г. па 1-га студзеня 1933 г. у абсяг 7-мі дзён. Заняткі з заліканьнем пачнуцца з 15-га студзеня 1933 г. Заявы накіроўваць па адрасе: г. Горкі БССР, рабфаку імя Галадзеда.

Дырэктар Рабфаку КАНДРЫЛЬ.

БЕЛЗАГАТЭКСПАРТ

КУПЛЯЕ КАЎРЫ

ручна-тканыя

за наяўны разьлік на выгодных умовах

З прапановай зварачацца: г. Менск, Сурская вул. № 10 (дом таможні) Белзагатэкспарт.

Па ўказаньні адрасу будзе высланы спэцыяліст для ацэнкі

Менск. друкарня «Зьвязды».